

102-ГАДОВЫ ДЫВЕРСАНТ І РАЗВЕДЧЫК

6

ПЛАКУЧАЯ ЯЛІНА І ЗАЧАРАВАНАЯ ПЯЧОРА

12



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

30 ЛІПЕНЯ 2019 г. АЎТОРАК № 141 (29008)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Леанід АНФІМАЎ, старшыня КДК:**

*«Не думаю, што Камітэт дзяржкантролю сёння быў бы такі, калі б адставаў ад сучасных тэндэнцый развіцця грамадства і эканомікі. Мы павінны апярэджваць час, працаваць на апярэджанне, каб не дапусціць развіцця негатыўных праяў. Дзейнасць камітэта шмат у чым залежыць ад існуючай эканамічнай сітуацыі, атмасферы ў грамадстве. Пасля таго як сітуацыя стабілізавалася, пастараліся памяняць падыходы ў кантрольнай дзейнасці, заклаўшы ў практыку, напэўна, галоўны прынцып, які дзейнічае і сёння, — «не нашкодзь». Зыходзячы з гэтага прынцыпу, мы выбудоўваем стратэгію і тактыку работы камітэта. Укараняюцца новыя метады. Ведамства перайшло ад татальных праверак да маніторынгаў, укаранёны прынцып аўдыту эфектыўнасці дзейнасці, калі ацэньваецца не нейкае парушэнне, а КДК дае заключэнне, наколькі эфектыўна суб'ект, які правяраецца, траціць дзяржаўныя сродкі, распараджаецца ўласнасцю».*

# АБЕД ПА РАСКЛАДЗЕ



**У СВК «Маяк Браслаўскі» Браслаўскага раёна на жніве шчыруюць 18 камбайнаў, якімі ўжо апрацавана больш за тысячу семсот гектараў збожжавых. Лідзіруюць на жніве браты Міхаіл і Віктар ВАЙТАНЕЦ — імі абмалочана з пачатку кампаніі больш за восемсот тон збожжа.** **СТАР. 7**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**У камбайнераў «Маяка» абед. На першым плане — Іван КУЛЬПА, Міхаіл ВАЙТАНЕЦ і яго брат Віктар ВАЙТАНЕЦ.**

## КОРАТКА

• **У Беларусі на 1 ліпеня пражывае крыху менш за 6 тысяч ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны.**

• Гродзенскі рэканструктар Андрэй Блажэвіч стварыў копію малой баявой ладдзі эпохі вікінгаў X ст.



• **3 жніўня ў Верхнім горадзе Мінска пройдзе свята карэйскай культуры.**

• Магістрант з Будапешта Давід Ковары за суткі наведаў на веласіпедзе сем краін.

ISSN 1990 - 763X

19141

9 771990 763008

Прыёмная кампанія — 2019

# У ТРЭНДЗЕ — ПРАГРАМІСТЫ І ЖУРНАЛІСТЫ

## У БДПУ і БНТУ адзначаюць рост прахадных балаў

**Напрыканцы мінулага тыдня ва ўсіх беларускіх ВНУ завяршылася залічэнне на бюджэтную форму навучання.** **СТАР. 3**



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

# ПА АБНОЎЛЕНЫМ ПРАЦОЎНЫМ КОДЭКСЕ

## Пачнём працаваць у наступным годзе

**Нядаўна Прэзідэнт Беларусі падпісаў закон аб зменах у Працоўны кодэкс. Як кажуць спецыялісты, гэтыя змены ўлічваюць інтарэсы як работнікаў, так і наймальнікаў, а таксама сучасныя тэндэнцыі на рынку працы. Разгледзім асноўныя навацыі закона.**

### КАНТРАКТЫ НА ГОД СЫДУЦЬ У МІНУЛАЕ

Па выніках маніторынгу, праведзенага летась, высветлілася, што больш за 60 % працоўных кантрактаў заключаны тэрмінам на год. Згодна з абноўленым Працоўным кодэксам, работнік, які адказна ставіцца да сваіх абавязкаў, цяпер можа разлічваць на больш працяглы кантракт. Так, калі работнік упершыню ўладкоўваецца на прадпрыемства, з ім можна заключыць кантракт на год. Але далей, калі паўстае пытанне падаўжэння працоўных адносін, наймальнік абавязаны прапанаваць работніку, які не допускае парушэнняў працоўнай дысцыпліны, кантракт да заканчэння максімальнага тэрміну яго дзеяння — гэта значыць да пяці гадоў. Калі па заканчэнні пяцігадовага тэрміну наймальнік і работнік маюць намер працягваць працоўныя адносіны, новы кантракт павінен быць адразу на тры гады. На меншыя тэрміны кантракты будуць працягвацца (альбо заключацца новыя) толькі з пісьмовай згоды работніка. Акрамя таго, пасля заканчэння тэрміну дзеяння пяцігадовага кантракта наймальнік мае права заключыць з добрасумленным работнікам працоўны дагавор на нявызначаны тэрмін.

Што датычыцца пенсіянераў, якія працуюць, то для большай абароны іх правоў пры звальненні ў сувязі з парушэннем наймальнікам заканадаўства аб працы, калектыўнага дагавора або кантракта работнікам пенсійнага ўзросту цяпер таксама будзе выплачвацца мінімальная кампенсацыя ў памеры трох сярэднямесячных зарплат. **СТАР. 7**

# АСНОВА — СПРАВЯДЛІВАЕ І ШЧЫРАЕ СТАЎЛЕННЕ ДА ЛЮДЗЕЙ

Прэзідэнт прыняў кадравыя рашэнні

**На вакантную з красавіка гэтага года пасаду старшыні Гомельскага аблвыканкама кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка прызначыў Генадзя Салаўя, які дагэтуль у якасці першага намесніка старшыні аблвыканкама курыраваў на Гомельшчыне развіццё аграпрамысловай галіны, ахову навакольнага асяроддзя і землеўпарадкаванне.**

Генадзь Салавей родам з Гродзеншчыны, заатэхнік па першай адукацыі, кіраваў гаспадаркамі, Клецкім і Нясвіжскім раёнамі, з лістапада мінулага года працуе на Гомельшчыне.

«Ну, Генадзь Міхайлавіч, мы з табой на гэту тэму гутарылі, і па-мужчынску, зусім нядаўна, пару дзён таму. Калі бярэшся, значыць, ведаеш, куды ідзеш, — звярнуўся Прэзідэнт да Генадзя Салаўя. — Працавац, сам бачыў. Галоўнае, каб быў вынік».

Кіраўнік дзяржавы ахарактарызаваў Гомельскую вобласць як рэгіён няпросты. «Канешне, там цэлы клубок праблем, і мне здаецца, нягледзячы на тое, што самая паўднёвая вобласць, яна больш складаная нават, чым Віцебская. На перспектыву. Там трэба вельмі сур'ёзна папрацаваць, пачынаючы ад севазваротаў і заканчваючы прамысловымі гігантамі, пра што сведчыць сітуацыя на «Гомсельмашы», — сказаў ён.

Прэзідэнт дадаў, што інфармаваны пра Генадзя Салаўя як пра чалавека, як пра добрага кіраўніка, які пасля абмеркавання прымае канкрэтныя рашэнні без хістанняў.

Гомельская вобласць заставалася без губернатара з вясны гэтага года, пасля таго, як Уладзімір Дворнік, які ўзначальваў вобласць на працягу 9 апошніх гадоў, быў прызначаны на пасаду віцэ-прэм'ера.

Памочнікам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — інспектарам па Віцебскай вобласці кіраўнік дзяржавы прызначыў Анатоля Лінevіча, які з сакавіка 2016 года ўзначальваў Капыльскі райвыканкам. Да чэрвеня пасаду памочніка Прэзідэнта — інспектара па Віцебскай вобласці займаў Віталь Воўк, былы міністр прамысловасці, які цяпер узначальвае Мінскі трактарны завод.

«Што датычыцца Віцебскай вобласці, там таксама вельмі шмат праблем, — звярнуўся кіраўнік дзяржавы да новага свайго памочніка ў гэтым рэгіёне. — Кандыдатаў было нямала. Нават учора прапаноўвалі аднаго кандыдата. Але я вызначыўся на вашай кандыдатуры, бо вы ведаеце сяло. І там сёння трэба вельмі сур'ёзна разбірацца з сельскай гаспадаркай. І самае галоўнае — не памыліцца! Каб не было такога, што мы нейкую прадушыну дадзім для стратных гаспадарак, якія так або інакш аб'ядноўваюцца ў нейкія структуры... А далей што? Таму хацелася б, каб вы, сыходзячы са свайго вопыту, уніклі ў гэтую праблему і ў найбліжэйшы час мы яе павінны разгледзець».

Анатоль Лінevіч нарадзіўся і пачынаў працоўную дзейнасць на Пружаншчыне начальнікам мехатрадаў. Узначальваў адно з вядучых сельскагаспадарчых прадпрыемстваў Брэсцкай вобласці ААТ «Жураўлінае», пазней — аграрнакамбінат «Мачулішчы» на Міншчыне, працаваў у Дзяржынскім райвыканкаме на пасадзе першага намесніка старшыні, начальніка ўпраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання.

Кіраўнік дзяржавы даў згоду на прызначэнне Дзмітрыя Корчыка на пасаду генеральнага дырэктара ААТ «Беларускі металургічны завод — кіруючая кампанія холдынга «Беларуская металургічная кампанія» і Аляксандра Асмалоўскага на пасаду старшыні праўлення ААТ «Беларуская універсальная таварная біржа».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што пасады, на якія прызначаюцца ўсе названыя кандыдаты, вельмі важныя і патрабуюць наведзення парадку.

Падчас прадстаўлення кіраўніку дзяржавы кандыдатаў на ўзгадненне старшынямі райвыканкамаў Прэзідэнт сказаў, што жадае пабываць у Кіраўскім раёне. Ён распытаў Аляксандра Бутарава, які сыходзіць з пасады старшыні Кіраўскага райвыканкама, пра слабыя і моцныя прадпрыемствы раёна і горада, добраўпарадкаванне Кіраўска, аграгарадкі, аб'яднанні гаспадаркі. Спытаў і пра тое, ці знаёмы Аляксандру Бутараву Горацкі раён, куды ён прызначаецца. «Гэта мая радзіма, — адказаў кандыдат на пасаду. — Я там вырас, вучыўся і працаваў».

Пацікавіўся Аляксандр Лукашэнка сённяшнім становішчам у Горках у Міхаіла Гулага, які там узначальваў вучэбна-вопытную гаспадарку, а цяпер атрымаў згоду на прызначэнне старшынёй райвыканкама ў Кіраўск.

Прэзідэнт звярнуўся да Сцяпана Палоннікава, які прызначаецца на пасаду кіраўніка Круглянскага раёна: «Круглае — гэта прыстойны раён, працаваць там можна і трэба, але праблем у вас хопіць, бо разоў 20 на год я бачу твой раён, як на далоні. Невялікі раён, там быў абраны ў свой час правільны кіраўнік, але трэба гэта падтрымліваць і рухацца далей».

Аляксандр Лукашэнка распытаў кандыдатаў пра сферы, за якія яны адказвалі, і пра тое, наколькі ім знаёмыя асаблівасці рэгіёнаў, на якія прызначаюцца.

Канстанцін Жыгуцкі расказаў пра рэалізацыю даручэння кіраўніка дзяржавы аб развіцці паўднёвага ўсходу Магілёўскай вобласці. Аляксандр Лукашэнка зноў акцэнтаваў увагу на тым, каб сельскагаспадарчая тэхніка, на якую выдаткоўваюцца дзяржаўныя грошы, добра захоўвалася і ўтрымлівалася. Што датычыцца тэрыторый, якія пацярпелі ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС, Прэзідэнт заўважыў: «Будзьце больш жорсткімі, не расслабляйцеся і паменш «рыданняў» з нагоды таго, што людзі не тыя, «чарнобыльскі раён» і іншае. Вы такія як усе! Слаўгарадскі і суседнія раёны, канешне, у свой час пацярпелі, людзей напужалі, разагналі, а зараз гераічнымі намаганнямі прыходзіцца вяртаць да жыцця гэтыя тэрыторыі. А без людзей гэта зрабіць немагчыма. Сёлета я пабуду ў паўднёва-ўсходніх раёнах Магілёўшчыны, трэба паглядзець, як рэалізуецца гэтая праграма. Там сустрэнемся і пагаворым».

Пагутарыўшы з кожным паасобку, кіраўнік дзяржавы звярнуўся да ўсіх з агульным наказам. «З палітыкі хачу пачаць. Гэты і наступны год, вы ведаеце, асаблівы. Не хачу казаць пра іх важнасць, пра гэта сказана нямала, ды і вы людзі дасведчаныя, у той або іншай якасці ўдзельнічалі ў такіх кампаніях, — сказаў ён. — Але асобна палітыкай у нас займацца няма каму, таму ўсё сканцэнтравана ў вашых руках, на месцы. Таму я вас прашу ўсё арганізаваць на годным узроўні. Становішча ў раёнах, куды вы накіроўваецеся, рознае, але ў цэлым яно стабільнае. Людзі цяперашнюю ўладу падтрымліваюць, і крытыкі хапае, што правільна. Таму трэба размаўляць з людзьмі, ні ў якім разе не павінна быць ніякага ціску, трэба людзей інфармаваць. Адней сіцеся да людзей па-чалавечы!»

Прэзідэнт загадаў падтрымліваць парадак не толькі ў аграгарадках і райцэнтрах. «Паглядзіце на выплату заробкаў. Пастарайцеся зрабіць усё, каб у заробках быў прырост. І не дзеля выбараў, — акцэнтаваў увагу будучых кіраўнікоў раёнаў Аляксандр Лукашэнка. — Запыт на справядлівасць нікуды не дзеўся. Аснова нашай з вамі палітыкі — справядлівыя і шчырыя адносіны да людзей».

Датычна эканомікі асноўны акцэнт Прэзідэнт паставіў на сельскай гаспадарцы.

Ён зноў паўтарыў задачу, сфармуляваную на нядаўняй селектарнай нарадзе па ўборачнай кампаніі: ніжэй за 9 мільёнаў тон збожжа сёлета сабраць нельга, імкнуцца трэба да 9,5 мільёна тон. «Жорстка будзем кантраляваць урад і, канешне, вас. Бо ад вас гэта залежыць!» — звярнуўся ён да кандыдатаў на пасады старшынь райвыканкамаў.

Спыніўся Аляксандр Лукашэнка на яшчэ адной нядаўна паднятай тэме: адказнасць дзяржслужачых за падзеж жывёлы. «Я вас прашу: звярніце на гэтыя праблемы асаблівую ўвагу! Адказнасць будзе вельмі сур'ёзная за гэтыя рэчы. І гэта прамая наша недапрацоўка. Калі вы накіроўваецеся ў гэтыя раёны, значыць там трэба навесці парадак», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

**Кіраўнік дзяржавы назначыў:**

САЛАЎЯ Генадзя Міхайлавіча — старшынёй Гомельскага аблвыканкама;

ЛІНЕВІЧА Анатоля Канстанцінавіча — памочнікам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — інспектарам па Віцебскай вобласці;

ГУР'ЯНАВА Аляксандра Яўгенавіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Сан-Марына па сумяшчальніцтве.

**Прэзідэнт таксама даў згоду на назначэнне:**

ШУБСКАГА Аляксандра Мікалаевіча — старшынёй Глыбоцкага райвыканкама;

ГУТАРАВА Віктара Сяргеевіча — старшынёй Шумілінскага райвыканкама;

СІДАРЭНКІ Аляксандра Мікалаевіча — старшынёй Жыткавіцкага райвыканкама;

ТУРУКА Андрэя Васілевіча — старшынёй Кармянскага райвыканкама;

КРУКОВІЧА Яўгена Міхайлавіча — старшынёй Валожынскага райвыканкама;

МЕЛЬНІКА Валерыя Віктаравіча — старшынёй Любанскага райвыканкама;

ПІЛІШЧЫКА Сяргея Міхайлавіча — старшынёй Капыльскага райвыканкама;

БУТАРАВА Аляксандра Міхайлавіча — старшынёй Горацкага райвыканкама;

ГУЛАГА Міхаіла Уладзіміравіча — старшынёй Кіраўскага райвыканкама;

ПАЛОННІКАВА Сцяпана Іванавіча — старшынёй Круглянскага райвыканкама;

ЖЫГУЦКАГА Канстанціна Аляксандравіча — старшынёй Асіповіцкага райвыканкама;

МІХАЛЮТЫ Сяргея Валер'евіча — старшынёй Слаўгарадскага райвыканкама;

УЛАСЕВІЧА Віталя Эдуардавіча — кіраўніком адміністрацыі Першамайскага раёна Бабруйска;

КОРЧЫКА Дзмітрыя Аляксандравіча — генеральным дырэктарам ААТ «Беларускі металургічны завод — кіруючая кампанія холдынга «Беларуская металургічная кампанія»;

АСМАЛОЎСКАГА Аляксандра Рыгоравіча — старшынёй праўлення ААТ «Беларуская ўніверсальная таварная біржа»;

КАДЛУБАЯ Аляксандра Уладзіміравіча — намеснікам міністра адукацыі;

НЕСЦЯРОВІЧА Сяргея Анатолевіча — першым намеснікам міністра сувязі і інфарматызацыі;

ЯКАБСОНА Андрэя Львовіча — намеснікам начальніка Беларускай чыгункі.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Кітайскія ўлады ацанілі шкоду, нанесеную беспарадкамі ў Ганконгу



Грамадскія беспарадкі негатыўна адбіваюцца на ганконгскай эканоміцы і фінансавым сектары гэтага спецыяльнага адміністрацыйнага раёна, заявіла афіцыйны прадстаўнік канцылярыі Дзяржсавета КНР па справах Ганконга і Макаа Сюй Луін, перадае ТАСС. «Да нядаўняга часу ў Ганконгу падтрымліваліся добрыя ўмовы для вядзення бізнесу, — адзначыла яна на прэс-канферэнцыі. — Аднак сутыкненні і гвалт, якія адбываюцца ў апошнія дні, аказалі сур'ёзны негатыўны ўплыў на грамадскі парадак гэтага рэгіёна, як і на міжнародную сітуацыю. Калі зніжаецца давер камерцыйных колаў, фінансавы сектар натуральным чынам становіцца больш уразлівым да знешніх рызык». Па словах прадстаўніка, цяпер вельмі важна спыніць эскалацыю гвалту. У адваротным выпадку ўзмоцняцца негатыўныя тэндэнцыі ў эканоміцы Ганконга, якія можна назіраць па падзенні рознічных продажаў і зніжэнні турпатоку.

### «Слуга народа» забярэ ўсе пасады ва ўрадзе Украіны

Прадстаўнік прэзідэнта Украіны Уладзіміра Зяленскага ў кабінеце міністраў Андрэй Герус заявіў, што партыя «Слуга народа» забярэ ўсе міністэрскія партфелі сабе. Пра гэта ён расказаў у інтэрв'ю «РБК-Украіна». Паводле слоў Андрэя Геруса, фармальна ў парламенце ўжо ёсць кааліцыя, і гэта манабольшасць прэзідэнцкай партыі. «Няма такога, каб апазіцыя была ва ўрадзе. У парламенце, думаю, некаторыя камітэты аддадуць апазіцыі, каб ні ў кога не было сумненняў у дэмакратычнасці новай улады. Якія менавіта — пакуль не ведаю», — сказаў Герус. Па выніках апрацоўкі 100 % бюлетэняў на парламенцкіх выбарах партыя «Слуга народа» зможа сфарміраваць аднапартыйную большасць, атрымаўшы 254 з 450 мандатаў. Супрацоўніцтва з партыяй музыканта Святаслава Вакарчука «Голас» магчымае, аднак гэта будзе залежаць ад іх пазіцыі і пажаданняў. Пастоў ва ўрадзе прыхільнікі Вакарчука ў любым выпадку не атрымаюць.

### У Кабуле 20 чалавек загінулі ў выніку нападу на офіс кандыдата ў віцэ-прэзідэнты

У Кабуле на працягу шасці гадзін праходзіла перастрэлка з баевікамі, якія напалі на офіс кандыдата ў віцэ-прэзідэнты Афганістана Амрулы Салеха. Загінулі дваццаць чалавек, яшчэ пяцьдзесят былі паранены, паведамляе агенцтва TOLONews са спасылкай на прадстаўніка МУС краіны. Атака пачалася пасля таго, як каля офіса Салеха і ўзначальваемага ім палітычнага руху выбухнуў замініраваны аўтамабіль. Пасля гэтага па меншай меры чацвёра баевікоў пачалі абстрэльваць будынак. У момант выбуху Салех з яшчэ прыкладна сотняй прыхільнікаў знаходзіліся ў будынку. Палітык атрымаў раненне, яго эвакуявалі. Нападнікі былі ліквідаваныя. Офіс знаходзіцца па суседстве з жылымі дамамі і ўніверсітэтам. У МУС паведамілі, што 16 загінулых у перастрэлцы аказаліся мірнымі грамадзянамі. Напад на Салеха асудзілі ва ўрадзе Афганістана, колішні прэзідэнт краіны Хамід Карзай, а таксама прадстаўнікі ААН і ўлады Індыі і Пакістана.

## ВЕКТАР СУПРАЦОЎНІЦТВА

Учора ў Мінску стартаваў І Форум рэгіёнаў Беларусі і Узбекістана

**На працягу двух дзён на розных сталічных пляцоўках праходзіць маштабная падзея — першы ў гісторыі беларуска-ўзбекскіх адносін форум рэгіёнаў.**

У панядзелак адбыліся секцыйныя пасяджэнні, прысвечаныя ўзаемнаму развіццю аграпрамысловага комплексу, прамысловай кааперацыі дзвюх краін, іх супрацоўніцтву ў сферы IT-тэхналогій, навукі, адукацыі і гуманітарных пытаннях. У гэты ж дзень быў урачыста адкрыты першы ў Беларусі помнік-бюст вялікаму ўзбекскаму паэту і дзяржаўнаму дзеячу Алішэру Наваі.

Сёння ў Палацы Рэспублікі ўдзельнікі форуму абмяркуюць тэму супрацоўніцтва на ўзроўні рэгіёнаў. Менавіта ён, на думку арганізатараў, з'яўляецца ключавым фактарам у развіцці міждзяржаўных адносін. На пленарным пасяджэнні прадстаўнікі дэлегацый агучаць прапановы па актуалізацыі існуючай дарожнай карты супрацоўніцтва, а таксама новыя кірункі ў двухбаковым дыялогу.

Плануецца, што на форуме будзе падпісана каля 15 дагавораў аб супрацоўніцтве і 20 камерцыйных кантрактаў.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

# ПА ЗДАРОЎЕ... У САД!

## «Спартыўны, актыўны, даступны» — праект, які дапаможа пачаць і працягнуць весці здаровы лад жыцця

**Прафілактыка — лепш за лячэнне, а штодзённая прафілактыка роўная здароваму ладу жыцця. Каб падтрымаць ЗЛЖ у краіне, Міністэрствам аховы здароўя праводзіцца мноства рэспубліканскіх акцый для розных узроставых груп, пачынаючы ад самых маленькіх жыхароў краіны ў дзіцячых садках.**

Напрыклад, «Школа — тэрыторыя здароўя» накіравана на агульнаадукацыйныя школы краіны, праект «Мой стыль жыцця сёння — маё здароўе і поспех заўтра» разлічаны на вышэйшыя навучальныя ўстановы, і за першае паўгоддзе 2019-га да яго далучылася ўжо 41 ВНУ. Адзін з самых маштабных прафілактычных рэспубліканскіх праектаў «Здаровыя гарады і пасёлкі» сёння ўключае 66 удзельнікаў — населеных пунктаў. Акрамя таго, у мэтах прафілактыкі насельніцтву рэгулярна прапануюць вымераць ціск не толькі ва ўстановах аховы здароўя, але і ў гіпермаркетах, крамах, на прамысловых прадпрыемствах. За першае паўгоддзе 2019 года ціск з прафілактычнай мэтай вымералі больш як 650 тысяч чалавек, паведаміла **галоўны спецыяліст аддзела гігіены, эпідэміялогіі і прафілактыкі Міністэрства аховы здароўя Вікторыя СПЕРАНСКАЯ.**

З 1 жніўня ЮНІСЕФ сумесна з Міністэрствам аховы здароўя Беларусі запускае новы марафон здаровага ладу жыцця «#САД — спартыўны, актыўны, даступны!». Кожны чацвер з 18.00 да 21.00 мінчане змогуць абсалютна бясплатна далучыцца да цэлага шэрагу актыўнасцяў, атрымаць кансультацыі ад вядучых спецыялістаў, прайсці экспрэс-абследаванне і скласці свой асабісты пашпарт здароўя. Мерапрыемствы будуць праходзіць на базе Рэспубліканскага цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі па фрыстайле. Напрыклад, у першы дзень праекта, 1 жніўня, удзельнікі змогуць бясплатна заняцца пілатэсам, схадзіць у «Велашколу» ўсёй сям'ёй, паспрабаваць сябе ў адзінаборствах, тайскім боксе і ёзе. А ўрач-дыетолаг дапаможа скласці рацыён харчавання і дасць карысныя рэкамендацыі. Кожны чацвер на пляцоўцы «САД» будуць працаваць розныя спецыялісты — кардыёлагі, неўролагі, валеолагі, урачы агульнай практыкі, траўматолагі-артапеды.

— *Спецыялісты будуць выкарыстоўваць «разумныя» вагі, якія вызначаць долю тлушчавай тканкі, шчыльнасць мінеральнай тканкі костак і мышачную масу, а таксама «разумны» танометр, які дапаможа вызначыць праблемы з сардэчнымі рытмамі,* — расказала **галоўны ўрач установы аховы здароўя «39-я гарадская клінічная паліклініка» Вольга ЕСМАНЧЫК.** — *Пасля запаўнення пашпарта здароўя ўдзельнікі праекта змогуць атрымаць рэкамендацыі ўрачоў накont таго, якая фізічная актыўнасць падыходзіць ім больш за ўсё і якіх рызык пажадана пазбягаць.*

— Здаровы лад жыцця важны з моманту планавання цяжарнасці, нараджэння і да канца жыцця, — кажа **намеснік прадстаўніка ЮНІСЕФ у Беларусі Габрыэла Івона АКІМАВА.** — Толькі калі мы ўсе падумаем пра сваё здароўе, пра прафілактыку захворванняў, тады і будзем сапраўды здаровым грамадствам.

Ва ўсе дні правядзення марафону будуць прадстаўлены розныя віды сумесных актыўнасцяў для мам і дзяцей, а таксама людзей з дадатковымі патрэбамі, арганізаваны выступленні ментараў, фудкоўчаў і матывацыйных спікераў, аўтограф-сесіі ад вядомых спартсменаў і здаровыя фудкорты. Напрыклад, у першы дзень праекта са сваёй матывацыйнай лекцыяй перад удзельнікамі выступіць **майстар спорту, член Паралімпійскай беларускай зборнай па плаванні Аляксей ТАЛАЙ.** *«Прымайце ўдзел у гэтым цудоўным праекце і памятайце, што здароўя шмат не бывае, кожная выпітая чарка або выкураная цыгарэта, б'е па вашым патэнцыяле»,* — адзначыў Аляксей.

Каб прыняць удзел у праекце, трэба зарэгістравацца на сайце марафонзож.бел. Удзельнікаў чакаюць прызы, напрыклад, калі зрабіць 50 тысяч крокаў за 5 дзён і размясціць фота, якое гэта пацвярджае, у сацсетцы з хэштэгам #GoMicrolife з адзнакай @vodnomizmerenii і перадаць эстафету двум сябрам, то кожны чацвер можна выйграць танометр. А калі прад'явіць запоўнены пашпарт здароўя ў адным з кінатэатраў Мінска, то можна купіць другі білет усяго за капейку. Самы актыўны ўдзельнік марафону атрымае галоўны прыз ад арганізатараў — «разумныя» вагі.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

# У ТРЭНДЗЕ — ПРАГРАМІСТЫ І ЖУРНАЛІСТЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Як ужо паведамлялася раней, сёлета адбыўся першы набор у сумесны беларуска-кітайскі інстытут БДУ і Даляньскага політэхнічнага ўніверсітэта. Прахадны бал на спецыяльнасць «фізіка (вытворчая дзейнасць)» склаў 322, а на спецыяльнасці «механіка і матэматычнае мадэляванне» — 305 балаў.

Традыцыйна адны з самых высокіх прахадных балаў зафіксаваныя ў БДУ на факультэце міжнародных адносін, эканамічным і факультэце журналістыкі. Так, на спецыяльнасць «лінгвакраіназнаўства» прахадны бал склаў 378, «міжнародныя адносіны» — 379, «міжнароднае права» — 385. На журфаку прахадныя балы былі наступныя: «журналістыка (кірунак — аўдыёвізуальная)» — 389, «журналістыка (кірунак — вэб-журналістыка)» — 382. А для паступлення на спецыяльнасць «менеджмент» (кірунак — «міжнародны менеджмент», інавацыйны менеджмент») трэба было набраць не менш як 371 бал. Дарэчы, менавіта на факультэт міжнародных адносін падала дакументы абітурыентка з сумай балаў 399.

У Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэце прахадныя балы на шматлікія тэхнічныя спецыяльнасці павялічыліся ўдвая ў параўнанні з 2018 годам. Так, напрыклад, на спецыяльнасць «шматмэтавыя гусенічныя і колавыя машыны» прахадны парог склаў 222 балы (летась 109), «апрацоўка металаў ціскам» — 210 балаў (летась было крыху больш як 100 балаў).

На спецыяльнасці «маркетынг» конкурс у БНТУ дасягнуў 5,5 чалавека на месца, «аўтасэрвіс» — 4,93. У ліку найбольш запатрабаваных у абітурыентаў спецыяльнасцяў таксама «праграмнае забеспячэнне інфармацыйных сістэм», «інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі», «прамысловае і грамадзянскае будаўніцтва», «транспартная лагістыка», «тэхнічная эксплуатацыя аўтамабіляў», «тэхналогіі машынабудавання», «арганізацыя перавозак і кіраванне на аўтамабільным і гарадскім транспарце».

У БДУІР прахадныя балы на дзённай форме атрымання адукацыі вагаюцца на факультэтах ад 296 да 364. Студэнтамі БДУІР сталі 85 абітурыентаў, якія набралі 370 балаў і больш. Максімальныя балы склаліся на спецыяльнасці «інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі (у гульнявой індустрыі)» — 364 (конкурс — 6,7 чалавека на месца), электронны маркетынг — 363 (3,2 чалавека на месца) і «праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій» — 359 (3,7 чалавека на месца).

Мінімальныя прахадныя бал зафіксаваны на спецыяльнасцях «электронныя і інфармацыйна-кіруючыя сістэмы фізічных установак» — 296, «нанатэхналогіі і нанаматэрыялы ў электроніцы» — 300 і «радыётэхніка (праграмуемыя радыёэлектронныя сродкі)» — 304.

Рэкорд сёлетняй прыёмнай кампаніі ў БДУІР — 390 балаў: столькі набрала ў суме будучая першакурсніца факультэта інфармацыйных тэхналогій і кіравання спецыяльнасці «інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі (у гульнявой індустрыі)» Аляксандра Іванковіч.

У Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце сярэдні конкурс па ВНУ склаў больш за два чалавекі на месца. На некаторых спецыяльнасцях на месца прэтэндавала да 10 чалавек (у прыватнасці, на спецыяльнасці «руская мова і літаратура. Замежная мова»), а напрыклад, на спецыяльнасці «выяўленчае мастацтва і камп'ютарная графіка» было больш як восем прэтэндэнтаў на месца.

Сярод будучых першакурснікаў — больш за паўтары сотні медалістаў і ўладальнікаў дыпломаў ССНУ з адзнакай. У БДПУ паступілі таксама больш як 210 выпускнікоў профільных педагагічных класаў (з іх каля 130 чалавек скарысталіся правам паступлення без іспытаў па выніках гутаркі; сярэдні бал атэстата ў выпускнікоў педкласаў — 8,9). Рост прахадных балаў назіраецца амаль па ўсіх спецыяльнасцях (максімальны прырост склаў 115 пунктаў). Самыя высокія прахадныя балы на дзённую бюджэтную форму навучання зафіксаваныя на спецыяльнасцях «выяўленчае мастацтва і камп'ютарная графіка» — 322, «лагапедыя» — 314, «руская мова і літаратура» — 306, «псіхалогія» — 305, «практычная псіхалогія» — 304.

Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт аказаўся прывабным не толькі для дзяўчат. Напрыклад, на факультэце фізічнага выхавання хлопцаў налічваецца 65 % ад агульнай колькасці першакурснікаў, на гістарычным факультэце — каля 50 %, а на фізіка-матэматычным — больш за 40 %.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## Свята ў хату!

# Новая пажарная часць, вячэрнія канцэрты, музычны фантан

## Брэст адзначыў 75-ю гадавіну вызвалення і Дзень горада

**Афіцыйныя святкаванні пачаліся з важнай і прыемнай падзеі — урачыстага адкрыцця новай пажарнай аварыйна-выратавальнай часці Брэсцкага гарадскога аддзела па надзвычайных сітуацыях. Пажарнае дэпо ўзведзена ў паўднёва-заходнім мікрараёне горада, які актыўна будуецца і развіваецца. Тут ужо пражывае звыш 60 тысяч чалавек, а з часам будзе яшчэ больш. Падобны аб'ект выглядае жыццёва неабходным, таму названая часць і была ўключана ў праграму падрыхтоўкі да святкавання 1000-годдзя горада. Фінансаванне праведзена за кошт рэспубліканскага бюджэту.**



Фота Валерыя КАРАЛЯ.

На адкрыццё новай пажарнай часці прыехалі **старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, міністр па надзвычайных сітуацыях Уладзімір ВАШЧАНКА.** Разам з **кіраўніком Брэстчыны Анатолем ЛІСАМ** яны выканалі ганаровую місію: перарэзалі сімвалічную стужку і пажадалі калектыву дэпо паспяховай работы.

Цэнтральнымі мерапрыемствамі гэтага дня заўсёды робіцца ўшанаванне памяці воінаў-вызваліцеляў Брэста і даніна павагі абаронцам крэпасці. Так было і гэтым разам. На плошчы Свабоды да помніка «Вызваленне» ўсклалі кветкі кіраўнікі гарадскіх адміністрацый, прадстаўнікі грамадскіх, маладзёжных арганізацый, гараджане. Да Вечнага агню ў Брэсцкай крэпасці былі ўскладзены вянкі. **Старшыня Брэсцкага гарвыканкама Аляксандр РАГАЧУК** падкрэсліў, што 28 ліпеня 1944 года з'яўляецца адной з самых светлых дат у тысячагадовай гісторыі горада.

Падзеяй для Брэста, несумненна, стала адкрыццё святломузычнага фантана на пешаходнай вуліцы Савецкай.

Вядома, канцэрты класічнай музыкі сталі годным акордам Дня горада. «Вячэрняя сімфонія тысячагоддзя» прайшла на плошчы Леніна і сабрала шмат людзей. Тыя, каму не хапіла месца ў імправізаваным партэры, слухалі музыку за парапетамі, там было зручна глядзець з экранаў, куды арганізатары накіравалі трансляцыю. Сто гадоў таму падобныя канцэрты праходзілі ў Гарадскім садзе, а цяпер — на плошчы, дзе можа сабрацца значна больш людзей. І гараджане гэта ацанілі, як і канцэрт вечарам наступнага дня «Класіка ля ратушы з velcom І А1». Сапраўды, якое ж свята без музыкі — і добрай музыкі гэтым разам было нямала. Чаго вартыя прыезд віртуоза гітары і ўлюбёнца брэсцкіх жанчын Тома Сінатры!

Ну а для тых, хто аддае перавагу актыўнаму адпачынку, былі наладжаны «Экватар Фэст», «Фестываль кветак», дзе можна было пагуляць, павесяліцца, выйграць прызы, смачна паесці.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## Ну і ну!

# Прадставілася супрацоўніцай санэпідэмстанцыі і скрала грошы

**Як паведамляе афіцыйны сайт групы інфармацыі і грамадскіх сувязяў упраўлення ўнутраных спраў Гомельскага аблвыканкама, у канцы мінулага тыдня, 26 ліпеня, неўстаноўленая дзяўчына ў 15.13 зайшла ў краму «Тавары для дома» ў вёсцы Залессе Чачэрскага раёна.**

Там яна прадставілася работнікам абласнога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі і паведаміла, што агледзіць гандлёвы пункт на прадмет выяўлення недахопаў. «Праверыўшы» магазін, яна ўказала загадчыцы на быццам бы знойдзеныя «парушэнні» і сказала, што сума штрафу складае 45 рублёў.

Работнік крамы перадала грошы невядомай, і тая выйшла з гандлёвага памяшкання. Якіх-небудзь дакументаў, якія пацвярджалі б факт правядзення праверкі або выплаты штрафу, дзяўчына не пакінула.



Учора днём стала вядома, што аператыўнікі Савецкага РАУС Гомеля ў абласным цэнтры затрымалі падазраваную ў здзяйсненні гэтага злачынства дзяўчыну, паведаміў **афіцыйны прадстаўнік УУС Гомельскага аблвыканкама Віталь ПРЫСТРОМАЎ.** Затрыманай аказалася непрацуючая 29-гадовая жыхарка Барысаўскага раёна Мінскай вобласці.

**Канстанцін ЛЮТКЕВІЧ.**

**Сакратарыят Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокія спачуванні Івашчанка Вользе Георгіеўне, намесніку начальніка ўпраўлення арганізацыйнай і ідэалагічнай работы, у сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

Сумесны выпуск газеты «Звязда» і Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя
№ 4 (42)

Надзённае

# Падыходы да адходаў

**Як спыніць захаванне другасных рэсурсаў на палігонах і якасна арганізаваць збор смецця — гэтыя і іншыя пытанні разгледзелі ўдзельнікі калегіі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.**



Фота прэс-службы Мінпрыроды.

Падчас калегіі Мінпрыроды.

На працягу апошніх двух гадоў пытанні эксплуатацыі аб'ектаў захавання цвёрдых камунальных адходаў (ЦКА) і недапушчэнне захавання на іх другасных матэрыяльных рэсурсаў (ДМР) знаходзяцца ў зоне асаблівай увагі Мінпрыроды і яго тэрытарыяльных органаў.

**Начальнік галоўнага ўпраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі, біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Вольга САЗОНАВА** расказала, што ў першым паўгоддзі 2019 года Мінпрыроды праведзена больш за 4000 абследаванняў аб'ектаў захавання ЦКА. Было выяўлена 1252 факты захавання ДМР, да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнута 499 вінаватых асоб (на 35 % больш, чым у аналагічны перыяд 2018 года), складзена 94 прадпісанні (амаль у тры разы больш, чым летась), выдадзена 387 рэкамендацый, накіравана 625 інфармацыйных лістоў аб устараненні выяўленых парушэнняў. Агульная сума накладзеных штрафаў за захаванне ДМР склала больш за 161 тысячу рублёў. Гэтая сума больш чым у два разы перавышае суму штрафаў, накладзеных у 2018 годзе за аналагічны перыяд.

Як адзначылі ўдзельнікі калегіі, арганізацыя збору адходаў і раздзяленне іх па відах каля крыніцы ўтварэння, а таксама недапушчэнне захавання змяшаных ЦКА без іх сартавання на сённяшні дзень — галоўныя механізмы ў існуючай інфраструктуры сістэмы збору, нарыхтоўкі, вывазу і размяшчэння камунальных адходаў. Але пасля ўкаранення новых метадаў абыходжання з ЦКА, такіх як энергетычнае выкарыстанне, а таксама выкарыстанне арганічнага складніка, арганізацыя пааслобнага збору адходаў можа быць перагледжана.

Для ўдасканалення дзеючага заканадаўства Мінпрыроды ўнесены шэраг змен у Закон «Аб абыходжанні з адходамі». Яны прадугледжваюць перадачу паўнамоцтваў Мінпрыроды сумесна з Міністэрствам жыллёва-камунальнай гаспадаркі на зацвярджэнне тэхнічнага кодэкса ўстаноўленай практыкі абыходжання з камунальнымі адходамі; уключэнне ў схемы абыходжання з ЦКА парадку абыходжання з адходамі, што ўтвараюцца на тэрыторыі садовачых кааператываў і садаводчых таварыстваў. Гэтыя і іншыя змены ўступаюць у сілу з 9 снежня 2019 года.

**Міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй ХУДЫК** падкрэсліў, што неабходна прымаць кардынальныя меры па стварэнні для насельніцтва ўмоў для арганізацыі пааасобнага збору адходаў, у тым ліку па відах другасных матэрыяльных рэсурсаў, выключыўшы захаванне апошніх на палігонах; прыняць вычарпальныя меры па рэалізацыі мерапрыемстваў, прадугледжаных Нацыянальнай стратэгіяй па абыходжанні з цвёрдымі камунальнымі адходамі і другаснымі матэрыяльнымі рэсурсамі ў Рэспубліцы Беларусь да 2035 года, а таксама па выкананні даручэнняў Прэзідэнта па пытаннях вымання другасных матэрыяльных рэсурсаў з камунальных адходаў і іх уцягвання ў гаспадарчы абарот.

**Вераніка КОЛАСАВА.**

Міжнароднае супрацоўніцтва

# «Экзамен» для стратэгіі

**Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя пры падтрымцы Еўрапейскага саюза прыступае да стратэгічнай экалагічнай ацэнкі (СЭА) праекта «Водная стратэгія — 2030»**

Як расказалі ў прэс-службе Мінпрыроды, ацэнку праекта «Стратэгія кіравання воднымі рэсурсамі ва ўмовах змены клімату на перыяд да 2030 года», ці «Водная стратэгія — 2030» будзе праводзіць спецыяльна створаная група нацыянальных экспертаў, у склад якой увайшлі вопытныя спецыялісты ў галіне кіравання воднымі рэсурсамі, аховы здароўя, геалогіі, гідрагеалогіі, ландшафтаў і землекарыстання, біяразнастайнасці, якасці паветра і змены клімату, сацыяльна-эканамічных пытанняў.

У ліпені 2019 года група пачала вызначэнне сферы ахопу СЭА, у тым ліку апісанне ключавых пытанняў у сферы аховы навакольнага асяроддзя і здароўя насельніцтва, якія закранаюцца праектам «Водная стратэгія — 2030», а таксама аналіз патэнцыйна магчымых трансгранічных уздзеянняў. На наступных этапах эксперты правядуць стратэгічны мэтавы аналіз, праверку магчымых наступстваў, разгледзяць альтэрнатывы і распрацуюць рэкамендацыі, накіраваныя на прадухіленне і мінімізацыю магчымых адмоўных наступстваў рэалізацыі стратэгіі. Падрыхтоўка экалагічнага даклада па СЭА, а таксама канчатковай версіі «Воднай стратэгіі — 2030» з улікам рэкамендацый СЭА запланавана на пачатак 2020 года.

Тэхнічную і арганізацыйную дапамогу Беларусі ў рэалізацыі пілотнага праекта аказвае ЕЭК ААН пры фінансаванні Еўрапейскага саюза ў рамках праграмы «Водная ініцыятыва Еўрапейскага саюза Плюс». Замежныя калегі акажуць беларускім спецыялістам метадычную дапамогу, правядуць шэраг семінараў і трэнінгаў па практычным прымяненні стратэгічнай экалагічнай ацэнкі.

— Мы накіроўваем значную колькасць фінансавых і чалавечых рэсурсаў на стварэнне, удасканаленне і выкарыстанне прыродаахоўнага заканадаўства, — адзначыла **начальнік аддзела міжнароднага супрацоўніцтва Мінпрыроды Ларыса ЛУКІНА.** — Задачы, якія перад намі стаяць, носяць глабальны характар, таму міжнародны і еўрапейскі вопыт рашэння агульных праблем для нас вельмі важны.

Адзін з чаканых вынікаў сумеснага пілотнага праекта — падрыхтоўка справаздачы аб адпаведнасцях і адрозненнях патрабаванняў нацыянальнага заканадаўства па СЭА і палажэнняў Пратакола па СЭА. Гэтая ацэнка ў будучым можа стаць дадатковай крыніцай інфармацыі пры разглядзе пытання аб магчымым далучэнні нашай краіны да Пратакола па СЭА.

**Настасся АЛЯКСЕЕВА.**

Фота прэс-службы Мінпрыроды.



Каманда СЭА.

# Вартавыя надвор'я

## Як змянілася гідраметэаралагічная служба Беларусі за 95 гадоў свайго існавання

### ДВА СТАГОДДЗІ НАЗІРАННЯЎ

Першыя інструментальныя гідраметэаралагічныя назіранні за зменай метэаралагічных працэсаў на тэрыторыі Беларусі пачаліся яшчэ ў першай палове XIX стагоддзя. Адным з першых гарадоў, дзе яны былі арганізаваны, стаў Магілёў — у 1808 годзе. Затым такія пункты з'явіліся ў Віцебску (1810), Брэсце (1834), Бабруйску (1836), Горках (1841) і Мінску (1846). Назіранні не былі пастаяннымі — яны перарываліся, потым аднаўляліся.

1 ліпеня 1924 года пры Народным камісарыяце земляробства было створана метэаралагічнае бюро. Гэты дзень лічыцца датай утварэння Гідраметэаралагічнай службы Беларусі. Да сярэдзіны 1941 года ў БССР дзейнічала вялікая гідраметэаралагічная сетка. На тэрыторыі краіны знаходзілася 464 пункты назіранняў і станцыі.

У гады Вялікай Айчыннай вайны было страчана каля 300 працаўнікоў гідраметэаслужбы; звыш 85 % станцый і 90 % пастоў аказаліся разбуранымі; каштоўнае абсталяванне і тэхнічны архіў у большасці загінулі ці былі вывезены ў Германію.

Пасля заканчэння вайны назіральная сетка стала аднаўляцца і рэарганізавацца. З'явіліся спецыялізаваныя станцыі — балотная, азёрная, лясная, агра- і авіяметэаралагічныя і іншыя.

З 1960-х пачалі ўкараняцца інструментальныя назіранні і аўтаматызацыя працэсу вытворчасці, збору, апрацоўкі і распаўсюджвання гідраметэаінфармацыі.

Сёння дзяржаўная сетка гідраметэаназіранняў уключае 176 аб'ектаў. Гэта філіялы Белгідрамета, цэнтры па гідраметэаралогіі і маніторынгу навакольнага асяроддзя; авіяцыйныя, аграметэаралагічныя, гідралагічныя, метэаралагічныя, балотная станцыі; станцыя фонавага маніторынгу; гідралагічныя пасты і аўтаномныя пункты прыземных метэаназіранняў.



Адзін з кірункаў дзейнасці Белгідрамета — радыяцыйны маніторынг.

### ЯК СТАЦЬ СІНОПТЫКАМ?

Будучыя гідраметэаролагі праходзяць навучанне ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Спецыялісты Белгідрамета чытаюць для студэнтаў лекцыі, праводзяць практычныя заняткі, кіруюць курсавымі і дыпломнымі работамі, удзельнічаюць у распрацоўцы і ўзгадненні навучальных планаў, праграм і г. д.

На базе Белгідрамета студэнты праходзяць навучальную, вытворчую і пераддыпломную практыкі. Многія з іх затым пачынаюць сваю прафесійную дзейнасць у гідраметэаслужбе краіны. Сёлета яе структурныя падраздзяленні папоўняць восем выпускнікоў факультэта геаграфіі і геаінфарматыкі БДУ.

Падчас стажыроўкі маладыя спецыялісты замацоўваюцца за больш дасведчанымі калегамі і працуюць разам.

### ТЭХНАЛОГІІ ДЛЯ ЯКАСНЫХ ПРАГНОЗАЎ

Каб складаць прагнозы з высокай ступенню верагоднасці, акрамя прафесійнай падрыхтоўкі сіноптыкаў, неабходна выкарыстоўваць новыя тэхналогіі, у тым ліку аўтаматызаваныя сродкі вымярэнняў. Не так даўно на 43 пунктах назіранняў былі размешчаны аўтаматычныя метэастанцыі, а летась арганізаваны тры новыя пункты.

У снежні 2018 года ў раёне ваеннага гарадка Уручча ўведзена ў эксплуатацыю метэаралагічная станцыя «Мінск» — яе абсталяванне дазваляе бесперапынна праводзіць розныя віды назіранняў. Акрамя таго, у сталіцы былі таксама аднаўлены аэралагічныя назіранні, якія не праводзіліся з 1998 года.



Доплераўскі метэаралагічны радыёлакатар дапаможа больш эфектыўна прагназаваць навальніцы, вызначаць ліўневыя і градавыя ачагі.

Сёлета плануецца арганізаваць новы аўтаномны пункт назіранняў у Лельчыцах і ўстанавіць аўтаматызаваныя метэаралагічныя сістэмы яшчэ на сямі дзеючых пунктах назіранняў.

Летась на тэрыторыі аэрапорта ў Віцебску з'явіўся доплераўскі метэаралагічны радыёлакатар. Цяпер праводзіцца тэсціраванне яго абсталявання. Плануецца таксама будаўніцтва радыёлакатара і ў аэрапорце Гродна. Такія прылады дапамогуць больш эфектыўна выяўляць кучава-дажджавыя аблокі, прагназаваць навальніцы, вызначаць ліўневыя і градавыя ачагі.

### А ШТО ДАЛЕЙ?

Сістэма і сетка маніторынгу атмасфернага паветра цяпер праходзіць глыбокую мадэрнізацыю. Часткова гэты працэс звязаны з рэалізацыяй праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі «Падтрымка эфектыўнага маніторынгу выкідаў у атмасфернае паветра і радыяцыйнага маніторынгу, удасканаленне кіравання навакольным асяроддзем у Беларусі», часткова — гэта мера ў адказ на павелічэнне магутнасці прамысловых аб'ектаў з адпаведнымі зменамі віду і характару іх уздзеянняў на паветра.

Дзякуючы мадэрнізацыі да 2025 года плануецца стварыць сістэму, якая дазваляе задавальняць інфармацыйныя запатрабаванні з улікам найлепшых даступных метадаў, тэхналогій і лабараторных практык, што ўжываюцца ў краінах ЕС.

**Вераніка КОЛАСАВА.**

Дынастыя

# Галоўны па замежных справах

## Дзякуючы рабоце міжнароднага аддзела Мінпрыроды Беларусь атрымала больш за 40 млн долараў грантаў

**Аляксандр Мікалаевіч РАЧЭЎСКІ — асоба ў сістэме Мінпрыроды легендарная. Мяркуйце самі: разам з калегамі ствараў ведамства, больш за дваццаць гадоў адказваў за міжнародныя сувязі Мінпрыроды. Ён — дзясяты чалавек, які атрымаў званне «Ганаровы эколаг». Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», медалём «За працоўныя заслугі». Аляксандр Мікалаевіч і пачынальнік дынастыі: яго сын Яўген таксама звязаў сваю кар'еру з прыродаахоўнай дзейнасцю.**


Рачэўскія — малодшы і старэйшы.

— Нарадзіўся ў Брагіне, дзе вакол горада вельмі прыгожыя мясціны. А мне з дзяцінства быў цікавы навуковы падыход да прыроды, таму сумненняў не ўзнікала: паступаю на геафак, — расказвае Аляксандр Мікалаевіч. — Атрымаўшы дыплом, застаўся на кафедры, якраз пачала работу лабараторыя возераназнаўства пры БДУ. Яе стварылі Міністэрства меліярацыі СССР і Мінсельгасхарч БССР. У лабараторыі быў вельмі высокі ранг, даследаванні праводзіліся не толькі на тэрыторыі сучаснай Беларусі, але і на прыродных аб'ектах СССР. Ганаруся, што дзякуючы нашай працы ўдалося захаваць нямала беларускіх азёраў.

Калі Беларусь здабыла незалежнасць, да работы ў міністэрствах і ведамствах пачалі прыцягваць у тым ліку і спецыялістаў з ВНУ. Аляксандра Рачэўскага запрасілі ў Дзяржаўны камітэт па ахове навакольнага асяроддзя на пасаду начальніка аддзела навукі і замежных сувязяў. Менавіта ў пачатку 90-х фарміраваліся прыродаахоўныя навуковыя ўстановы «БелНДЦ «Экалогія», ЦНДІКВВР, выйшаў у свет навуковы часопіс «Прыродныя рэсурсы», была створана Рэспубліканская дзяржаўная праграма «Ахова навакольнага асяроддзя і прыродакарыстанне». І сёння гэтыя структуры — па-ранейшаму базавыя навуковыя падраздзяленні.

У 1994 годзе Дзяржкамітэт быў пераўтвораны ў Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Аляксандр Мікалаевіч 15 гадоў з'яўляўся членам калегіі ведамства. У гэтым статусе прымаў удзел у распрацоўцы практычна ўсіх ключавых нарматыўна-прававых дакументаў. Аляксандр Рачэўскі — адзін з суаўтараў Закона «Аб ахове навакольнага асяроддзя».

— У Міністэрстве ўзначаліў аддзел міжнароднага супрацоўніцтва і навукі. У той час найважнейшай задачай з'яўлялася ўмацаванне і наладжванне новых кантактаў з замежнымі партнёрамі, перш за ўсё з найбліжэйшымі суседзямі — Расіяй, Украінай, Літвой, Латвіяй, Польшчай, — працягвае Аляксандр Мікалаевіч. — Трэба было не толькі напрацоўваць практыку міжнародных дагаворна-прававых адносін, але ажыццяўляць удзел нашай краіны ў міжнародных прыродаахоўных арганізацыях. Аб нашай працы можна меркаваць па такіх лічбах: у 1995 годзе Беларусь стала ўдзельнікам пяці міжнародных канвенцый па ахове навакольнага асяроддзя, а ў 2012-м — ужо 22.

Удзел у міжнародных праектах даваў магчымасць краіне атрымліваць гранты на прыродаахоўныя мерапрыемствы. Неяк дзеля цікавасці палічыў: у маю бытнасць было прыцягнута больш за 40 млн долараў. Наогул, мы пераймалі шмат замежнага вопыту, і цяпер наша заканадаўства, напрыклад, па сістэме комплексных прыродаахоўных дазволаў на выкіды ў атмасфернае паветра, спецыяльнае водакарыстанне, захоўванне і захаванне адходаў вытворчасці аналагічнае з тым, што дзейнічае ў ЕС.

**— Пры такой нагрузцы ў Міністэрстве вы яшчэ навуковай дзейнасцю займаліся. Ці быў час на адпачынак?**

— Змена дзейнасці — гэта таксама адпачынак. Аднак знаходзіўся час і на любімы занятак — рыбалку. Часта выбіраўся разам з сынам. Вядома, было і такое, што пры падрыхтоўцы нейкіх дакументаў альбо міжнародных мерапрыемстваў дадому прыходзіў літаральна на пару гадзін.

**— А як сям'я да такога графіка ставілася?**

— З разуменнем. У нас, ведаеце, сямейнае геаграфічнае таварыства. Жонка, малодшы брат і яго жонка, мой сын — усе выпускнікі геафака БДУ. Таму жывём агульнымі прафесійнымі інтарэсамі, ва ўсім падтрымліваем адзін аднаго.

**— Сярод вашых узнагарод і медаль Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы.**

— З расійскімі калегамі у нас цесныя рабочыя сувязі, рэалізавалася пяць агульных дзяржпраграм у прыродаахоўнай галіне, гідраметэаралагічнай дзейнасці і геалогіі. Таксама і з іншымі краінамі СНД добрыя партнёрскія адносіны. У 1992 годзе мы правялі першы міждзяржсавет па экалогіі, гэтая традыцыя захавалася і дагэтуль.

**— Колькі дзён вы пабылі пенсіянерам у чыстым выглядзе?**

— Пакуль яшчэ не паспеў. На пенсію пайшоў з міністэрства і пяць гадоў працаваў у міжнародным падраздзяленні ў Белгідрамеце. Затым — у цэнтры экалагічнай экспертызы, цяпер выкладаю ў рэспубліканскім вучэбным цэнтры Мінпрыроды.

**— Як вам працуецца цяпер?**

— Вельмі цікава, у нас моцны выкладчыцкі склад. Работа бадзёрыць: самому трэба пастаянна вучыцца, асвойваць новыя формы выкладання. Нашы слухачы зацікаўлены ў атрыманні ведаў, што аблягчае працэс адукацыі. Іншая справа, на мой погляд, і я абмяркоўваў гэта з калегамі: тыдзень — недастатковы тэрмін для навучання. У нашы інспекцыі часам прыходзяць людзі без профільнай адукацыі, ім даводзіцца вучыцца, як той казаў, у полі, і ў іх няма права на памылку, таму што, паказаўшы некампетэнтнасць адзін раз, аўтарытэт страціць назаўжды.

**— Аляксандр Мікалаевіч, у Мінпрыроды кажуць: Рачэўскі-старэйшы і Рачэўскі-малодшы. Раскажыце пра сына.**

— На геафак паступіў паводле сямейнай традыцыі. А вось на работу ў сістэму Мінпрыроды прыйшоў не адразу. Спачатку паспрабаваў сябе ў бізнесе, працаваў у розных кампаніях. Потым працаўладкаваўся ў Мінскі гарадскі камітэт прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, быў і начальнікам аддзела аператыўнага кантролю, курыраваў некалькі раёнаў. Затым яго перавялі ў Міністэрства начальнікам аддзела экалагічнай экспертызы горадабудаўнічых праектаў. Цяпер працуе намеснікам дырэктара па дзяржаўнай экалагічнай экспертызе Рэспубліканскага цэнтра дзяржаўнай экалагічнай экспертызы і павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў Мінпрыроды. Ніколі не цісну на сына, той сам рабіў выбар. Лічу, усебаковы вопыт ідзе толькі на карысць работы.

**— А калі ён вырашыў, што хоча працаваць у сістэме Мінпрыроды, дапамагалі?**

— За руку па кабінетах не вадзіў, спецыяльна нікому не тэлефанаваў. Хлопцу з прозвішчам Рачэўскі, напэўна, было няцяжка атрымаць работу ў нашай сістэме. А вось потым было складаней, бо яму нельга падвесці бацьку, любы яго промах расцэньваўся б як наш агульны. Яўген малайчына, спраўляўся і спраўляецца, хоць участак у яго цяпер вельмі складаны і адказны.

**Аксана ЯНОЎСКАЯ**
**Фота з уласнага архіва Аляксандра РАЧЭЎСКАГА.**

Экаадукацыя

# Адпачываем па-зялёнаму!

## Як летнія змены ў дзіцячых лагерах дапамогуць развіваць рух «Зялёных школ»

**Вучыцца падчас канікул — такі нестандартны спосаб бавіць летні час выбралі для сябе 140 школьнікаў з розных куткоў Беларусі. Чым жа займаліся ўдзельнікі незвычайнай змены?**

У пачатку ліпеня дзіцячы рэабілітацыйна-аздараўленчы цэнтр «Надзея», што ў Вілейскім раёне, прымаў удзельнікаў першай у краіне змены «Зялёных школ». Гэта стала магчыма дзякуючы праекту «Уцягванне грамадскасці ў экалагічны маніторынг і паляпшэнне кіравання аховай навакольнага асяроддзя на мясцовым узроўні» («Экаманіторынг»), які фінансуецца Еўрапейскім саюзам і рэалізуецца ПРААН у партнёрстве з Мінпрыроды.

Каб трапіць на экалагічную змену, і школьнікі, і педагогі прайшлі сур'ёзны конкурсны адбор. Разам з адпачынкам іх чакала штодзённая праца па пяці кірунках — інтэрактыўныя гульні і экскурсіі, вопыты і дыскусіі, заданні па экалагічным маніторынгу, захаванні біяразнастайнасці, энерга- і водазберажэнні, вырашэнні праблемы адходаў.

У Дзень адчыненых дзвярэй дзеці прадэманстравалі практычную частку сваёй працы — былі арганізаваны тэматычныя пляцоўкі, дзе шмат цікавай інфармацыі атрымалі як самі юныя эколагі, так і іх дарослыя калегі.

На пляцоўцы **«Энергазберажэнне»** кожны мог даведацца, чаму важна правяраць, ці адключаныя ўсе непатрэбныя электраприборы, навошта даставаць з разеткі зарадныя прылады, а таксама чаму неабходна ўдзельнічаць у экалагічных акцыях.

Якія тры асноўныя «водныя» праблемы сёння вельмі хвалююць эколагаў? Вызначыць іх дапамаглі на станцыі **«Водазберажэнне»** — педагогі прапанавалі школьнікам вызначыць колькасць нітратаў у пітной вадзе, вылічыць у складзе бытавой хіміі і касметычных сродкаў небяспечныя для прыроды і чалавека фасфаты і мікрапластык.


У дзіцячым цэнтры «Надзея» збіраюць адходы асобна і дапамагаюць дзецям з інваліднасцю.

— Мы імкнёмся працаваць са школьнікамі так, каб атрыманыя імі веды актыўна прымяняліся на практыцы, — кажа **спецыяліст па ўстойлівым кіраванні воднымі рэсурсамі Цэнтра экалагічных рашэнняў Наталля ПАРЭЧЫНА.** — Вось і падчас змены дзеці пасля праведзеных даследаванняў стварылі і перадалі бацькам відэаролік-пасланне па гэтай тэме.

На пляцоўцы **«Абыходжанне з адходамі»** хлопцы і дзяўчаты паказалі, як яны сартуюць смецце, наколькі добра разбіраюцца ў экалагічнай маркіроўцы тавараў і часе раскладання розных відаў адходаў.

Цікавыя заданні падрыхтавалі для школьнікаў і арганізатары пляцоўкі **«Біяразнастайнасць»**.

— Падчас эказмены мы з дзецьмі вывучалі ў тэорыі расліны, птушак і іншых жывёл, — расказвае **педагог з Кобрынскага эколага-біялагічнага цэнтра, выхавальнік Аляксандр СТРАЧУК.** — Каб паказаць, наколькі яны засвоілі матэрыял, дзецям неабходна было выканаць заданне па арніталогіі: па апісанні віду знайсці яго ў вызначальніку, а потым і ў натуральным асяроддзі.

Незвычайным экспанатам на пляцоўцы **«Якасць атмасфернага паветра»** сталі... лішайнікі. Так, менавіта розныя віды гэтай расліны дапамаглі ўдзельнікам эказмены вызначыць, наколькі чыстае паветра ў лагеры.


Каб знайсці птушку ў прыродзе, трэба добра ведаць яе характарыстыкі.

Каб экалагічнае навучанне было больш дасканалае, у дзіцячым цэнтры «Надзея» ў рамках праекта «Экаманіторынг» быў створаны «зялёны клас»: закуплена абсталяванне, інтэрактыўны матэрыял для вядзення заняткаў па ўсіх кірунках праграмы «Зялёных школ». У гэтым класе будуць займацца не толькі ўдзельнікі экалагічных змен, але і іншыя школьнікі, якія прыязджаюць сюды на аздараўленне, у тым ліку з тэрыторый, што пацярпелі ад аварыі на ЧАЭС, а таксама дзеці з абмежаванымі магчымасцямі.

**Вераніка КОЛАСАВА, фота аўтара.**

# ДЫВЕРСАНТ

**Пра славутага савецкага разведчыка і дыверсанта часоў Вялікай Айчынай вайны Аляксея Бацяна, які стаў прататыпам спачатку кніжнага, а потым і папулярнага кінагероя — «маёра Віхра».**

## Цяжар славы

Складана знайсці чалавека, які пасля выхаду на пенсію не адно дзесяцігоддзе рэгулярна выклікае шчыры інтарэс у СМІ. Публікацый пра Аляксея Мікалаевіча Бацяна назбіралася ўжо даволі шмат. Вось назвы асобных газетных артыкулаў: «Палкоўнік Бацян застаецца ў страі», «Аляксей Бацян. Вяртанне героя», «Аляксей Бацян — легенда савецкай разведкі» і г. д.

Для журналістаў і літаратараў персона Аляксея Бацяна выйгрышная на ўсе 100 працэнтаў, бо настолькі багатая на прыгоды і рэзкія павароты лёсу яго біяграфія, што не трэба нічога перабольшваць, дадумваць для прыгажосці тэксту ці абвастрэння інтрыгі сюжэту.

**Нават у 85-гадовым узросце сам за рулём на машыне прыязджаў з Масквы ў Чартавічы. І тыя, хто сябраваў з ім у дзяцінстве, заўважалі: Лёшка Бацянаў (так звалі яго ў вёсцы) амаль не змяніўся — размаўляе на іх мове, шмат жартуе, паважае самагонку і з апетытам закусвае салёным гуркам, каўбасой пальцам пханай, кумпяком, салам.**

І чым больш чытаеш гэтыя аповеды калег, тым больш здзіўляе маштаб асобы Аляксея Мікалаевіча, жыццё якога часта нагадвае вострасюжэтны прыгодніцкі раман. На жаль, і так і не напісаны пакуль, калі не лічыць рамана Юліяна Сямёнава, але пра яго трохі ніжэй. Здаецца, сёння сказаць што-небудзь прынцыпова новае пра справы палкоўніка Бацяна без допуску ў архівы КДБ практычна немагчыма. Сам Аляксей Мікалаевіч звычайна расказвае тое, што можна расказаць. Хоць з таго часу, як ён «вярнуўся з холаду», мінула шмат гадоў. Але многія дакументы па-ранейшаму захоўваюцца пад грыфам «сакрэтна». Відаць, на гэта ёсць важкія прычыны. Ды і сам Аляксей Мікалаевіч не любіць высоўвацца, ці, як сёння кажуць, займацца самапіярам.

Прыкладна з сярэдзіны гарбачоўскай перабудовы ён рэгулярна робіцца жаданым героем публікацый у газетах і часопісах, тэле- і радыёсюжэтаў, пра яго пішуць кнігі і здымаюць фільмы. З нагоды 70-годдзя вызвалення Беларусі і юбілею Перамогі ў Маскве прайшла прэзентацыя кнігі беларускага пісьменніка і даследчыка дзейнасці савецкай ваеннай контрразведкі Аляксандра Бандарэнкі «Сапраўдная гісторыя «маёра Віхра» (Партрэт разведчыка на фоне рассакрэчаных дакументаў). А перад гэтым чарговы фільм пра Аляксея Бацяна стаў часткай дзесяцісерыйнай кінастужкі пра выбітных савецкіх разведчыкаў, якая здымалася пры садзейнічанні Службы знешняй разведкі Расіі.



## Жыццё, поўнае рызыкі і неверагодных прыгод

Ці быў Аляксей гаспадаром свайго лёсу? І так, і не. Магчыма, сёння ён усё ж стаў бы школьным настаўнікам, як марыў у юнацтве. Але магутная хваля рэвалюцыйных і геапалітычных пераўтварэнняў захліснула беларускага хлопца і яго аднавяскоўцаў. Час тады быў неверагодны па сваіх радыкальных пераменах. Аляксей Бацян нарадзіўся 10 лютага 1917 года ў вёсцы Чартавічы ў некалі Віленскай губерні яшчэ царскай Расіі (цяпер гэта Валожынскі раён Мінскай вобласці). У сакавіку 1921 года Заходняя Беларусь адышла да Польшчы. Пачалося маларадказальнае жыццё ў краіне, дзе да жыхароў набытай тэрыторыі новыя ўлады ставіліся, мякка кажучы, не заўсёды прыязна, лічылі іх нечым накшталт людзей другога гатунку. Але з пачаткам Другой сусветнай вайны беларускіх хлопцаў у абавязковым парадку мабілізавалі на фронт. У верасні 1939 года капрал польскай арміі Аляксей Бацян абараняў Варшаву, дзе камандаваў разлікам зеніткі.

Потым быў палон, уцёкі, вяртанне дамоў ляснымі сцежкамі ўжо ў савецкую Беларусь. Скончыў настаўніцкія курсы ў Мінску, выкладаў у вясковай пачатковай школе. Як быццам мірнае жыццё наладжвалася. Аднак зноў рэзкі паварот лёсу. У 1940 годзе маладым настаўнікам зацікавіліся органы НКУС СССР і, дзякуй богу, не як ворагам народа. Відаць, зыходзячы з інфармацыі аб яго папярэдняй армейскай службе ў палякаў, здольнасцях да вывучэння моў, прыроднай кемлівасці 23-гадовага маладога чалавека накіравалі ўжо на зусім іншыя курсы: у разведвальную школу ў Маскве, якую ён скончыў у 1941 годзе напярэдадні вайны. А з ёй пачалася поўная трывог, рызыкі і неверагодных прыгод служба разведчыка і дыверсанта найвышэйшай катэгорыі, калі можна так сказаць. І выжыў, і пераадолеў, і вынес столькі ўдараў лёсу, што на некалькі жыццяў хапіла б.

102 гады Аляксея Бацяна выклікаюць вялікую павагу і нават здзіўленне яшчэ і па той прычыне, што асноўная частка яго жыцця, так бы мовіць, у працаздольным узросце прайшла ў стане пастаяннага стрэсу і ва ўмовах, вельмі далёкіх ад спрыяльных для нармальнага існавання чалавека. Ужо ў лістападзе 1941 года ён — камандзір разведвальна-дыверсійнай групы, якая за лініяй фронту дапамагала абароне Масквы. Колькі разоў ён аказваўся на грані жыцця і смерці...

Лёс разведчыка-дыверсанта — суцэльны экстрым. Кожная баявая аперацыя магла стаць апошняй для Аляксея Бацяна. А лік іх ішоў на дзясяткі. У тылу ворага даводзілася суткамі спаць на халоднай зямлі, крочыць лесам у адлігу ці ў веснавую бездараж шмат кіламетраў па калена ў вадзе, зрэдку, калі ноччу распальваць касцёр, харчавацца па мінімуме сухім пайком. Акрамя вядзення разведкі, даводзілася займацца знішчэннем камунікацый, ліній сувязі, дапамагаць партызанам праводзіць дыверсіі на чыгунцы, узрываць штабы, склады са зброяй і амуніцыяй. Цэнтр выкарыстоўваў Аляксея Бацяна на самых гарачых і небяспечных напрамках на тэрыторыі Украіны, Беларусі, Польшчы і Чэхаславакіі. І ўвесь час ён быў на перадавой і, заўважце, без ніводнага ранення. Як потым ён сам расказваў аднавяскоўцам, толькі аднойчы яго зачапіла варожая куля: трохі падрапала шчаку. Шчаслівчык.

## Не Штырліц, але Кракаў выратаваў

Аляксея Бацяна называюць прататыпам героя вядомага рамана «Маёр Віхр» Юліяна Сямёнава. Вобраз кніжнага маёра ўвабраў у сабе асобныя рысы характару і службовай біяграфіі Бацяна. Па матывах кнігі ў 1967 годзе быў зняты аднайменны трохсерыйны мастацкі фільм «Маёр Віхр».

Удзел у аперацыі па выратаванні Кракава ад знішчэння фашыстамі стаў апагеем у баявой кар'еры Аляксея Бацяна. Савецкае камандаванне надавала вялікую ўвагу гэтай аперацыі. Каб звесці да мінімуму верагодныя няўдачы, пазбегнуць разбурэння велічнага і прыгожага горада, у канцы 1944 года ў яго ваколіцы было закінута некалькі разведвальна-дыверсійных груп. Адну з іх узначальваў беларус Бацян, які выдатна размаўляў па-польску. Яму ўдалося наладзіць сувязі з польскімі патрыётамі. Тыя праз пэўны час паведамілі вельмі каштоўную на той момант аператыўную інфармацыю: немцы ўдарнымі тэмпамі назапашваюць у старажытным Ягелонскім замку велізарную колькасць выбуховых рэчываў. Іх, як паведамлялі іншыя крыніцы, меркавалася выкарыстаць для знішчэння гістарычнага цэнтра Кракава, Ражноўскай плаціны і мастоў праз раку Дунаец. Бацян прымае тады, як аказалася потым, адзінае правільнае рашэнне: з дапамогай палякаў замініраваць замак і напярэдадні вызвалення горада раніцай 18 студзеня 1945 года падарваць. Усё прайшло па плане.

Аперацыя групы Аляксея Бацяна і цяпер лічыцца ўзорам дыверсійнай работы, подзвігам, вартым самай высокай узнагароды. Але двойчы крамлёўскае начальства адхіляла прапановы кіраўніцтва разведкі СССР прысвоіць Бацяну званне Героя Савецкага Саюза. Прычыны знаходзіліся розныя, якія сёння ўспрымаюцца як недарэчныя і нават смешныя. У віну яму, у прыватнасці, ставіліся нараджэнне і жыццё ў Заходняй Беларусі, прымусовая служба ў польскай арміі, уступленне ў шлюб без пісьмовага дазволу кіраўніцтва з іншаземкай падчас працы нелегалам у адной еўрапейскай краіне. Вядома, такое стаўленне крыўдзіла Аляксея Мікалаевіча, але ён не скардзіўся. Як аднойчы прызнаўся журналістам наш герой, самай вялікай узнагародай для яго было тое, што ён застаўся жывы на той страшнай вайне.


mk.by

## Чорная паласа

Пасля вайны — зноў рэзкі паварот лёсу. Аляксей трапіў пад хрушчоўскую чыстку апарата КДБ СССР. Хаця ён ніколі не «разбіраўся» з унутранымі «ворагамі народу», яго звольнілі і літаральна выкінулі на вуліцу. З дапамогай сяброў удалося ўладкавацца ў шыкоўны рэстаран у цэнтры Масквы, які часта наведвалі іншаземцы, метрдатэлем-перакладчыкам. Пры працаўладкаванні вельмі дапамагло веданне моў.

Але апала была адносна нядоўгая. Яго зноў запрасілі на сакрэтную службу. Аказалася, што без прафесіяналаў усё ж цяжка вырашаць складаныя задачы датычна нацыянальнай бяспекі. Падчас замежных камандзіровак у еўрапейскія краіны яму нярэдка зноў даводзілася быць чужынцам сярод сваіх. І тады ён уключаў дар пераўвасаблення, каб не «запаліцца», не выдаць сваё сапраўднае паходжанне. І гэта самая закрытая частка яго біяграфіі, пра якую ён вельмі скупы на словы. Нелегал надоўга, калі не назаўсёды, застаецца носьбітам важных сакрэтаў. Такі ўжо лёс разведчыка. А вось з таго, што кансультаваў байцоў групы спецыяльнага прызначэння «Вымпел», сакрэту не робіць. У 1983 годзе палкоўнік Бацян выйшаў у адстаўку па ўзросце.


Гэтай прыгажосці магло б і не быць.

І толькі ў 2000-х справядлівасць была адноўлена. Ён нарэшце атрымаў узнагароду, вартую яго подзвіга. Указам Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі ад 10 мая 2007 года «за мужнасць і гераізм, праяўленыя ў ходзе аперацыі па вызваленні польскага горада Кракава і прадухіленні знішчэння яго нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны 1941—1945 гадоў» палкоўніку ў адстаўцы Бацяну Аляксею Мікалаевічу прысвоена званне Героя Расійскай Федэрацыі з уручэннем медаля «Залатая Зорка».

**Удзел у аперацыі па выратаванні Кракава ад знішчэння фашыстамі стаў апагеем у баявой кар'еры Аляксея Бацяна.**

## Лёшка Бацянаў — паважаны ў вёсцы чалавек

Асабіста я пачуў пра Аляксея Мікалаевіча яшчэ задоўга да перабудовы ад яго сваяка і аднавяскоўца журналіста Міхаіла Бацяна, майго сябра і аднакурсніка па журфаку БДУ. Відаць, невыпадкова Міхаілу беларускія кінематаграфісты прапанавалі напісаць сцэнарый дакументальнага фільма да 65-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Фільм, зразумела, цалкам быў прысвечаны Аляксею Бацяну, які з часам набыў статус легенды савецкай разведкі. У Чартавічах, дзе я бываў неаднаразова па запрашэнні Міхаіла, ён паказаў хату бацькоў Аляксея Мікалаевіча. У прыватнасці, згадаў, што той заўсёды пры магчымасці імкнуўся наведаць малую радзіму. Нават у 85-гадовым узросце сам за рулём на машыне прыязджаў з Масквы ў Чартавічы. І тыя, хто сябраваў з ім у дзяцінстве, заўважалі: Лёшка Бацянаў (так звалі яго ў вёсцы) амаль не змяніўся — размаўляе на іх мове, шмат жартуе, паважае самагонку і з апетытам закусвае салёным гуркам, каўбасой пальцам пханай, кумпяком, салам. Ну як вясковы мужык. Прыкідваўся? Не думаю. Ён зноў быў сваім сярод сваіх і адпачываў душой і сэрцам у родных мясцінах.

Словы з папулярнай песні «полковнику никто не пишет» не пра палкоўніка дзяржбяспекі Аляксея Бацяна. Яму напярэдадні 100-гадовага юбілею хто толькі не дасылаў віншаванні і адкуль толькі і не прыходзілі паштоўкі і лісты...

Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін павіншаваў Аляксея Бацяна са стагадовым юбілеем. «Такія людзі, як вы, па праве з'яўляюцца гонарам Расіі, і вельмі важна, каб ваша адказная грамадзянская пазіцыя, шчырая датычнасць да лёсу Айчыны былі прыкладам для падрастаючага пакалення», — гаворыцца ў тэлеграме кіраўніка дзяржавы.

І яшчэ пра адзін знамянальны падарунак. Ёсць такая традыцыя — даваць зоркам, унікальным алмазам імёны знакамітых людзей. Дык вось у гонар 100-годдзя нашага героя рашэннем Гахрана Расіі 100-каратнаму алмазу далі імя Аляксея Бацяна.

Але весткі з малой радзімы самыя чаканыя. І калі ў Маскву да Аляксея Мікалаевіча прыязджаюць землякі з Беларусі, то няма канца размовам і ўспамінам.

**Леанід ТУГАРЫН.**

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)*

Учора мне давялося пабыць на хлебным полі вытворчага аддзялення № 1 гэтай гаспадаркі. Камбайнамі «Палессе» кіравалі вопытныя спецыялісты сваёй справы: Валерый Ваштаевіч, Міхаіл Іваноў, Юрый Бабуль, Іван Ветраў, Іван Кульпа, браты Міхаіл і Віктар Вайтанец. Яны малацілі азімую пшаніцу на плошчы 66 гектараў. Добрай рабоце спрыялі і добрае надвор'е, і абед — гарачы, смачны, які па раскладзе прывезлі на поле. Некалькі хвілін на перакус — і хлебаробы гатовыя ісці заводзіць свае машыны.

На хлебнае поле прыехала і **галоўны аграном гаспадаркі Валянціна ТАЎКІНЬ**. Летась Валянціну Віктараўну ўзнагародзілі ганаровым званнем «Чалавек года Віцебскай вобласці».

— На сённяшні дзень СВК «Маяк Браслаўскі» ўбраў больш за сорак працэнтаў збожжавага кліна, — сказала галоўны аграном. — Тэмпы добрыя, каб толькі надвор'е нас не падвяло.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**



Галоўны аграном Валянціна ТАЎКІНЬ з упраўляючым аддзялення № 1 Валерыем ВАШТАЕВІЧАМ і галоўным інжынерам гаспадаркі Міхаілам ЯНУЛЁМ.



Кіроўца МАЗа Генадзь КУРАЧКА ўсё сваё працоўнае жыццё ўдзельнічае ў жніве.

# АБЕД ПА РАСКЛАДЗЕ



Адзін з найлепшых камбайнераў гаспадаркі Міхаіл ІВАНОЎ.



Абед на хлебным полі.

# ПА АБНОЎЛЕНЫМ ПРАЦОЎНЫМ КОДЭКСЕ

## ПАШЫРАЦЦА МАГЧЫМАСЦІ ДЛЯ ЗАНЯТАСЦІ

У прыватнасці, гэта датычыцца работы па сумяшчальніцтве. Цяпер можна будзе падчас адпачынку быць занятым у іншым месяцы па сумяшчальніцтве поўны працоўны дзень або змену. Таксама адрэгуляваны парадак часовага пераводу са згоды работніка на іншую работу, у тым ліку да іншага наймальніка, на тэрмін да шасці месяцаў. Новы працоўны дагавор пры гэтым не будзе заключацца — галоўнае, каб было ўлічана жаданне работніка.

## КАМПЕНСАЦЫЯ СТАНЕ БОЛЬШАЙ

У цяперашні час, калі работнік скасоўвае кантракт, таму што не згодны са зменай істотных умоў працы, наймальнік выплачвае яму двухтыднёвую зарплату. Паводле абноўленага Працоўнага кодэкса, калі чалавек вырашыць звольніцца з-за таго, што яго працоўны час скарочаны больш чым напалову (што з'яўляецца зменай істотных умоў працы), пры яго звальненні наймальнік павінен будзе выплаціць яму месячны заробак.

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)*

**Навацыі Працоўнага кодэкса ўступяць у сілу на пачатку наступнага года.**

## УЗАКОНЕНА ДЫСТАНЦЫЙНАЯ ПРАЦА

У новую рэдакцыю Працоўнага кодэкса ўключана частка, якая датычыцца работнікаў, што працуюць з выкарыстаннем інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій па-за месцам знаходжання наймальніка. Пры гэтым у працоўным дагаворы павінна быць дакладна пазначана, што праца з'яўляецца дыстанцыйнай. У астатнім у дыстанцыйнага работніка будуць тыя ж правы і абавязкі, што і ў звычайных работнікаў.

Варта мець на ўвазе, што дыстанцыйны работнік — гэта не тое ж самае, што фрылансер (многія блытаюць гэтыя паняцці). Фрылансер — гэта чалавек, які працуе сам на сябе, выконвае работу па заказе, заключыўшы грамадзянска-прававы дагавор, і нікому не падпарадкоўваецца. А дыстанцыйныя работнікі ўступаюць у працоўныя адносіны, і на іх у большай ступені распаўсюджваюцца нормы Працоўнага кодэкса.

## ДАДАТКОВЫ ВОДПУСК ДЛЯ БАЦЬКІ

У новай рэдакцыі Працоўнага кодэкса прадугледжаны водпуск для бацькі або айчыма пры нараджэнні дзіцяці. Яго працягласць складзе 14 дзён, якія можна выкарыстаць на працягу паўгода пасля нараджэння дзіцяці. Аплачвацца такі водпуск не будзе, таксама ён не будзе лічыцца часткай працоўнага водпуску. Пры гэтым у калектыўным дагаворы можна прапісаць пункт, які прадугледжвае аплату дадзенага перыяду.

**Усяго ў абноўленым Працоўным кодэксе было зменена больш за 200 артыкулаў і з'явілася 13 новых.**

Але не трэба блытаць такі бацькоўскі водпуск з адпачынкам па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў. Проста мужчыны атрымаюць магчымасць гэтыя два тыдні правесці разам з сям'ёй, быць побач з мамамі, якія выйшлі ў дэкрэтны адпачынак. Разам з тым ніхто не забараняе бацьку сысці ў «дэкрэт» замест маці дзіцяці. Цяпер, дарэчы, такой магчымасцю нашы мужчыны амаль не карыстаюцца: водпуск па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў узялі менш за 1 % беларусаў.

## ГАРАНТЫІ ДЛЯ ЧЛЕНАЎ ПРАФСАЮЗА

Цяпер калектыўны дагавор распаўсюджваецца на ўсіх работнікаў незалежна ад таго, з'яўляюцца яны сябрамі прафсаюза ці не. У абноўленым Працоўным кодэксе нормы калектыўнага дагавора вырашылі падзяліць на два віды. Па-першае, асноўныя, якія будуць датычыцца ўсіх работнікаў, — сюды ўваходзяць працягласць рабочага дня, час адпачынку, працоўны распарадак, сістэма аплаты працы і некаторыя іншыя істотныя пытанні. І па-другое, дадатковыя нормы, якія будуць рэгулявацца праз калектыўны дагавор і датычыцца ў асноўным членаў прафсаюза.

**Святлана БУСЬКО.**

Чэмпіёнка свету і Еўрапейскіх гульняў Таццяна ШАРАКОВА:

# «НА ТРЭНІРОЎКУ ПРЫХОДЗІЦЦА ЎЦЯКАЦЬ З ХАТЫ»

## Пра тое, як быць мамай-пераможцай

**Таццяна Шаракова нарадзілася ў Оршы, у сям'і чыгуначнікаў, але не пайшла па шляху бацькоў, выбраўшы спорт. Першы трэнер Любоў Нямкова адразу разгледзела ў маленькай Тані вялікае імкненне і лідарскія якасці і стала для Шараковай не толькі трэнерам на 25 гадоў, але і хроснай маці. Прайшоўшы ў юным узросце падрыхтоўку ў прэстыжным спартыўным цэнтры ў Швейцарыі, Таццяна ўсё роўна вярнулася ў Беларусь.**

У адной з гонак на трэку веласіпедыстка атрымала траўму пазваночніка, пасля чаго некалькі разоў у яе пераставалі функцыянаваць ногі, урачы забаранялі Таццяне працягваць займацца спортам, але напярэдадні ў яе быў чэмпіянат Еўропы, адмовіцца ад старту спартсменка не змагла. Больш за тое, яна заваявала на гэтым турніры медаль. Шмат пазней кар'еру Шараковай не змагла перапыніць нават цяжарнасць, хоць на нейкі момант Таццяна задумвалася аб развітанні са спортам. Вырашальным стартам для яе былі ІІ Еўрапейскія гульні, а там спартсменка выйграла «золата» і «бронзу». Таму цяпер яна, сумяшчаючы спорт з мацярынствам, рыхтуецца да чэмпіянатаў Еўропы і свету, а таксама не выключае шанцу трапіць на Алімпійскія гульні ў Токіа.

### «Алімпіяды складваюцца для мяне сумна»

***— Таццяна, зараз вы знаходзіцеся на падрыхтоўчым этапе?***

— Так, аднавілася пасля Еўрапейскіх гульняў і пачала рыхтавацца да чэмпіянату Еўропы, які пройдзе ў Галандыі 7—11 жніўня. Магчыма, адразу пасля Гульняў у Мінску такога скачка ў выніку не будзе, але прымаць удзел у чэмпіянаце мы павінны, бо будзем старацца як мінімум узяць ачкі ў рэйтынг краіны, цяпер яны вельмі важныя. Перад чэмпіянатам Еўропы, магчыма, яшчэ з'ездзім на гонку ў Іспанію, каб спаборнічаць не з чыстага ліста. А пасля кантынентальнага турніру будзе мэтанакіраваная падрыхтоўка да чэмпіянату свету.

> «Першы трэнер — гэта таксама адзін з бацькоў, які дае табе дарогу ў жыццё».

***— Барацьба за алімпійскія ліцэнзіі ў Токіа ўжо пачалася?***

— Так, ужо даўно і вясной 2020 года яна завершыцца. Пасля Еўрапейскіх гульняў у міжнародным рэйтынгу мы займалі 18-е месца, гэта гаворыць аб тым, што краіна прэтэндуе на дзве ліцэнзіі ў велаcпорце. Агульнымі намаганнямі пастараемся захаваць гэтыя пазіцыі, а потым ужо ўнутры каманды вырашыцца, хто адправіцца ў Токіа. Паедзе той, хто будзе ў найлепшай форме і каму больш будзе падыходзіць той рэльеф.

***— Вы ўжо ўдзельнічалі ў дзвюх Алімпіядах...***

— Але гэта быў трэк. Можна сказаць, што Алімпійскія гульні складваюцца для мяне сумна, дзве Алімпіяды і адно і тое ж 9-е месца.

***— Разбіралі, у чым прычына няўдач?***

— Для нас заўсёды складана даецца змена клімату. У Рыа ў мяне была вельмі вялікая ацёчнасць ног, таму цяжка было змагацца за медалі. Заўсёды падыходзіш да Гульняў у найлепшай форме, а потым нейкія дробязі пачынаюць адбівацца, у тым ліку і псіхалагічныя.

### «Мэр Оршы асабіста дапамог набыць першы добры ровар»

***— Вы нарадзіліся ў Оршы ў сям'і чыгуначнікаў, як узнік спорт?***

— З часам бацькі памянялі работу, таму што ў сям'і было чацвёра дзяцей, грошай не хапала. Бацька заўсёды прапагандаваў здаровы лад жыцця, прыдумляў для нас нейкія заняткі, і мяне цягнула ў спорт. Першапачаткова я займалася лёгкай атлетыкай і спявала — шукала сябе, была вельмі актыўная. Але спынілася на веласпорце. Спачатку былі некаторыя пытанні па здароўі, але з часам я іх перарасла. У 13 гадоў ужо досыць актыўна выступала з дарослымі дзяўчатамі, мне падабалася, што я магу іх абагнаць, гэты азарт заўважала і трэнер. Веласпорт фізічна не просты від спорту, але я, можна сказаць, універсальны спартсмен, у мяне добры «выбух» і цягавітасць, таму я люблю працяглыя дыстанцыі, мне яны не стамляюць.

***— Калі ў вас з'явіўся добры прафесійны, дарагі ровар?***

— Першапачаткова, вядома, у Оршы ў мяне не было добрага ровара, але потым, калі з юніёркай адбіралася на чэмпіянат свету, мэр горада асабіста дапамог набыць карбонавы ровар, мне прывезлі яго з Амерыкі. Ды і трэнер Любоў Нямкова заўсёды старалася дзесьці здабываць нам добрую форму, таму ў гэтым плане ў нас было ўсё цудоўна.

***— Пасля Оршы ўзнік замежны этап у вашай кар'еры, наколькі складана было з'ехаць ад сям'і ў юным узросце?***

— Я нарадзілася ў шматдзетнай сям'і, таму ўсе мы былі самастойнымі дзецьмі. Можа быць, таму я не баялася адна з'язджаць на спаборніцтвы, не баялася адказнасці. Смела паехала ў Швейцарыю, ведала, што будзе цяжка, трэба будзе вывучыць там мову, бо ў школе я вучыла іспанскую. Але мяне гэта не палохала, наадварот, падабалася, што я магу развівацца, пазнаваць штосьці новае.

***— У вашым спартыўным лёсе вялікую ролю адыграла першы трэнер Любоў Нямкова, з якой вы працуеце разам да гэтага часу...***

— Я лічу, што першы трэнер — гэта таксама адзін з бацькоў, які дае табе дарогу ў жыццё. Бо ў дзяцінстве мы не заўсёды ведаем, кім хочам стаць, жаданні мяняюцца, узнікае блытаніна, а калі ў цябе ёсць любімая справа і настаўнік, які можа падказаць, параіць, дапамагчы, з якога ты бярэш прыклад, то гэта вельмі вялікая знаходка. Мне пашанцавала з трэнерам. Калі я стала займацца, адразу зразумела, што павінна быць спартсменкай. Мне падабалася ў нас на базе, бо там была вельмі сямейная атмасфера, мы ўсе былі прыязныя, усе дапамагалі адзін аднаму. Я вельмі ўдзячная свайму трэнеру, яна дапамагла мне справіцца з многімі цяжкасцямі і стала нават маёй хроснай маці. Мы працуем ужо 25 гадоў разам, і за гэты час я ніколі не бачыла сэнсу мяняць трэнера, таму што ў мяне ўсё атрымліваецца. Калі штосьці не атрымліваецца, мы абавязкова разам гэта разбіраем і стараемся знайсці нейкі кампраміс.

### «Самае складанае — гэта разрыў з дзіцем»

***— Будучы ў спорце, вы не палохаліся нарадзіць дзіця і на час спыніць сваю кар'еру.***

— У кожнага спартсмена, напэўна, бывае такі перыяд, калі ты займаешся сваёй справай, але ўжо не атрымліваеш ад яе задавальнення, не ведаеш, што лепш, ці хочаш ты працягваць, ці трэба знайсці ў жыцці штосьці іншае. У мяне настаў менавіта такі перыяд. Я ганялася, былі медалі, але перыядычна я задавала сабе адно пытанне: у чым сэнс майго жыцця, калі гэтыя медалі ўжо не прыносяць мне задавальнення? Я прыходзіла дадому, але ўвесь час было неяк самотна ў душы. У выніку прыйшла да таго, што мне ўжо пара быць мамай, і вырашылася на гэта. Зацяжарала, сказала пра гэта трэнеру, яна мяне падтрымала. Першапачаткова я яшчэ трохі трэніравалася, трымала сябе ў форме, а потым у мяне паўстала пытанне, ці варта ўвогуле вяртацца ў спорт. Трэнер параіла атрымліваць задавальненне ад цяжарнасці, а ўжо пасля нараджэння дзіцяці вырашыць, ці хачу я працягнуць сваю кар'еру. Пазней маё вяртанне падтрымала кіраўніцтва, да таго ж хутка стартавалі Еўрапейскія гульні, і я падумала, чаму б не выступіць у сябе дома, магчыма, усё атрымаецца.

***— Вярнуцца было складана?***

— Абсалютна не. Будучы цяжарнай, да апошніх дзён я падоўгу хадзіла, рухалася, старалася чымсьці сябе займаць. Пачала трэніравацца праз месяц пасля родаў, гатовая да гэтага была і фізічна, і маральна. Калі чалавек адпачыў і з новымі сіламі, з новым прылівам вярнуўся, наадварот узнікае нейкая стараннасць, цябе нічога не спыняе. У душы я адчуваю сябе лідарам, таму, калі выязджаю на трэніроўку, ведаю, што ўсё атрымаецца. Прытым, калі ты вяртаешся і бачыш, што па ўзроўні не здаў, гэта надае сіл. Самае складанае для мяне — гэта разрыў з маленькім дзіцем, зараз Тэі год і месяц. Я ад'язджаю літаральна на пару дзён, прыязджаю і бачу, што дачка ўжо падрасла, а мяне не было побач — гэта вельмі цяжка. Тэя ўжо ўсё разумее і мяне не адпускае, калі раней я яе пакінула на сястру, бабулю, дзядулю і паехала, то цяпер яна ходзіць за мной, просіцца на рукі. На трэніроўку прыходзіцца ўцякаць з хаты. Але паколькі шлях працягваецца, трэба знаходзіць нейкія кампрамісы і для мяне, і для дзіцяці, спрабаваць усё гэта сумясціць. Цяпер гэта будзе ўжо больш складана, таму што Тэя расце, патрабуе нашмат больш увагі. Мне ўвесь час трэба штосьці для яе прыдумваць, кудысьці вадзіць, трэба трымаць сябе ў тонусе, быць мамай-запальнічкай.

***— З нараджэннем дачкі давялося карэктаваць свой геаграфічны графік падрыхтоўкі?***

— У пачатку сезона мы звычайна трэніруемся ў Турцыі, бо туды не патрэбна віза для дзіцяці, для мяне гэта было лёгка, таму што я проста брала Тэю з сабой. Зараз, калі стаіць пытанне аб падрыхтоўцы на сярэднягор'і, становіцца больш складана. Калі з дакументамі ўсё атрымаецца, то яна будзе працягваць вандраванне з мамай. Што датычыцца сур'ёзных спаборніцкіх гонак, то на нейкі перыяд нам прыйдзецца пабыць паасобку, бо на вялікую доўгую гонку я не змагу ўзяць дачку з сабой.

***— Тэя ўжо разумее, што яе мама пераможца?***

— Заўсёды, калі я прыязджала дадому са спаборніцтваў, прывозіла ёй медалькі і звязаныя клала іх у цацкі. Бо мама ж сыходзіць, таму павінна растлумачыць, чаму. Я прыношу ёй медаль і тлумачу, што мы з ёй яе сёння заслужылі. Цяпер яна ўжо актыўна пачала надзяваць іх на шыю, заўважаю, што, калі бачыць веласіпедыстку, пачынае гаварыць, што гэта мама.

***— Як вы адрэагуеце, калі Тэя захоча прайсці ваш шлях?***

— Першапачаткова я не хацела б, каб яна выбрала такую цяжкую справу для сябе. Хоць, вядома, было б добра, калі б Тэя займалася нейкім відам спорту, гэта трэба для развіцця дзіцяці. Але, напэўна, я не хацела б, каб яна была менавіта веласіпедысткай, бо гэта траўмы, падзенні, будуць пастаянныя перажыванні. Думаю, што для мяне гэта будзе, як другі раз пачаць сваю кар'еру зноў. Вядома, калі яна абярэ веласпорт, я не стану папярок і не скажу: "Не, ты не павінна". Буду падтрымліваць яе ў любых пачынаннях. Мая мама, дарэчы, таксама спачатку не хацела, каб я займалася веласпортам, а вось тата заўсёды быў «за».

### «Работа ідзе на лідара»

***— Вернемся да веласпорту, што вам бліжэй, трэк ці шаша?***

— Душа радуецца больш на шашы, таму што гэта пейзажы, рэльеф, але затое на шашы ты не атрымліваеш такой хуткасці, як на трэку, гэта проста выбух — вельмі зацягвае. Цікава быць усюды.

***— Якія адрэзкі вам больш падабаюцца — гарадскія або загарадныя?***

— Цікава ехаць па горадзе, гэта звілістыя прыгожыя вуліцы, усё ажыўленае, і табе неяк весялей круціцца, таксама гэта добра для развіцця і папулярызацыі веласпорту, бо цябе бачаць людзі. А за горадам ты адзін сярод дрэў.

***— Часта ў веласпорце прыходзіцца працаваць не толькі на сябе, але і на каманду.***

— У прынцыпе, калі ідзеш займацца веласпортам, ты першапачаткова павінен разумець, што гэта 100 % камандны від спорту. Сёння работа ідзе на лідара, усё роўна, ты гэта ці хтосьці іншы, ад гэтага залежыць, па-першае, рэйтынг тваёй каманды, куды мы адбяромся і як паедзем на наступных гонках. Тут усе павінны дакладна разумець, што гэта каманда, сёння раўніна, мы «развозім» аднаго, заўтра — горы, ёсць іншы лідар. Гэта нармальна.

***— Які тытул для вас цяпер самы важны?***

— Значны поспех — «золата» і «бронза» Еўрапейскіх гульняў, а таксама, вядома, маё званне чэмпіёнкі свету. Гэта вельмі важна для мяне. Хацелася б, вядома, мець нейкую ўзнагароду з Алімпійскіх гульняў, што, напэўна, самая галоўная мэта для любога спартсмена.





**Фота з асабістага архіва гераіні.**

# ТРАПІЦЬ НА ЛЕТНІ БІЯТЛОН? ЛЁГКА!

## Продаж квіткоў на чэмпіянат свету, які пройдзе з 23 да 25 жніўня ў Раўбічах, працягваецца

**Кошт білетаў складае ад 7 да 50 рублёў, яны паступілі ў продаж яшчэ 16 ліпеня і даступныя ў касах і на сайце афіцыйнага аператара Ticketpro.by. Зборная Беларусі на чэмпіянаце свету па летнім біятлоне будзе прадстаўлена наймацнейшым складам. У маючым адбыцца старце плануюць прыняць удзел і многія замежныя знакамітыя стралаючыя лыжнікі.**

На спаборніцтвы прыедуць спартсмены з Бельгіі, Кітая, Чэхіі, Вялікабрытаніі, Грэцыі, Венгрыі, Латвіі, Літвы, Малдовы, Манголіі, Польшчы, Расіі, Славеніі, Сербіі, Швейцарыі, Украіны і іншых краін. Паралельна з дарослымі біятланістамі будуць спаборнічаць і юніёры. У праграме — спрынт, суперспрынт і гонкі праследавання.

Цяпер нацыянальная зборная Беларусі па біятлоне прыступіла да трэцяга ў міжсезонні трэніровачнага збору ў рамках цэнтралізаванай падрыхтоўкі.

У складзе жаночай каманды да сезона рыхтуюцца пяць спартсменак — Ірына Крыўко, Дзінара Алімбекава, Ганна Сола, Алена і Ірына Кручынкіны. У мужчын на зборы трэніруюцца сямёра біятланістаў: Сяргей Бачарнікаў, Антон Смольскі, Раман Ялётнаў, Максім Варабей, Віктар Крыўко, Мікіта Лабастаў і Дзмітрый Лазоўскі.


biathlon.by

**Старэйшы трэнер жаночай зборнай Васіль ЛЕШЧАНКА** расказаў пра ўжо праведзеную і запланаваную на бліжэйшы час работу:

*— Для нашай каманды гэта ўжо трэці збор. Падрыхтоўку мы пачалі ў «Раўбічах», потым выязджалі ў армянскі Цахкадзор. Гэта не самае звыклае для нас месца, але збор атрымаўся выдатны: вышыня 2000 метраў, лес — нагрузкі пераносіліся вельмі добра. Цяпер зноў рыхтуемся да сезона ў Раўбічах: працуем над функцыянальнай падрыхтоўкай і стральбой — закладваем падмурак для будучага сезона. З 1 жніўня пачнём збор у Антхольцы, а вернемся з яго 21-22 жніўня — да дамашняга чэмпіянату свету па летнім біятлоне.*

Нагадаем, рашэнне аб правядзенні сусветнага форуму ў Беларусі было прынята на пасяджэнні выканкама Міжнароднага саюза біятланістаў у снежні 2016 года. Раней Раўбічы правялі тры чэмпіянаты свету па класічным біятлоне (1974, 1982, 1990), а ў 1999 годзе спарткомплекс ужо прымаў сусветнае першынство па летнім біятлоне. Акрамя таго, з 2 да 8 сакавіка 2020 года ў Мінску адбудзецца фінальны этап Кубка IBU. Першы этап Кубка свету па біятлоне прыме шведскі Эстэрсунд з 30 лістапада да 8 снежня. Па традыцыі адкрыюць спаборніцтвы ўдзельнікі адзіночнай змешанай эстафеты. Усяго ў Кубку свету 2019/2020 адбудзецца дзевяць этапаў.

Нагадаем, што па выніках мінулага сезона найлепшай беларускай біятланісткай стала Ірына Крыўко, якая заняла 20-е месца ў агульным заліку Кубка свету. У мужчын найбольш паспяхова выступіў Сяргей Бачарнікаў. Ён размясціўся ў агульным заліку на 48-м радку.

# ПАЗІТЫЎНЫ МАТЫВАТАР

## Вопыт Еўрапейскіх гульняў у кантэксце іміджу краіны, турызму і інфраструктуры

**Пасля завяршэння мультыспартыўнага турніру ў Мінску прайшоў ужо амаль месяц, але спецыялісты галіны працягваюць падводзіць яго вынікі.**

**Намеснік міністра спорту і турызму Беларусі Міхаіл ПАРТНОЙ** паведаміў, што ў час II Еўрапейскіх гульняў у Беларусі пабывала больш за 37 тысяч замежных турыстаў. Ён адзначыў, што да пачатку турніру яго арганізатары ставілі перад сабой мэту па колькасці замежных гасцей перасягнуць Еўрапейскія гульні ў Баку, куды ў 2015 годзе прыехала 28 тысяч замежнікаў.

*«Паводле звестак Дзяржаўнага пагранічнага камітэта, па квітках II Еўрапейскіх гульняў, якія замянялі візы, у нашу краіну ўехала 8167 замежных грамадзян, але ў гэтай статыстыцы не ўлічаны турысты з Расіі, Украіны і тых краін, з якімі ў нас уведзены бязвізавы ўезд, а таксама тыя, хто заехаў у краіну праз аэрапорт. Агульная колькасць замежных турыстаў па заніжанай ацэнцы складае 37 450. Але гэта папярэдняя звесткі, і, думаю, пасля справаздачы турфірмаў і апублікавання статыстычных даных іх колькасць будзе вышэйшая»*, — расказаў Міхаіл Партной.

Канчатковая колькасць арганізаваных турыстаў, якія пабывалі ў Мінску і Беларусі падчас II Еўрапейскіх гульняў, назавуць толькі ў канцы года. Вызначыць, колькі Беларусь у цэлым зарабіла на гэтых гульнях, таксама можна будзе толькі па выніках года, калі будзе сабраная ўся неабходная статыстычная суб'ектаў гаспадарання і дзяржорганаў.

З моманту ўвядзення бязвізавага рэжыму (20 мая) і да 10 ліпеня пагранічнікі зафіксавалі 766 183 перасячэнні мяжы. Найбольшая колькасць турыстаў прыязджала з Расіі, Украіны, Латвіі, Літвы, Польшчы, а самым распаўсюджаным відам транспарту, на якім была перасечана граніца, быў аўтамабільны, на другім месцы — авіятранспарт, на трэцім — чыгунка.

Пасажырапаток у Нацыянальным аэрапорце Мінск вырас у чэрвені амаль на 10 %, а ў перыяд правядзення II Еўрапейскіх гульняў — амаль на 80 %. С 19 чэрвеня па 1 ліпеня аэрапорт абслужыў 390 101 пасажыра — гэта на 78 % больш за аналагічны леташні перыяд (тады было 218 677 пасажыраў). Лік абслужаных за гэты перыяд рэйсаў вырас на 11 % — да 2458 (год таму было 2214), паведамілі ў прэс-службе Нацыянальнага аэрапорта Мінск. У перыяд правядзення Гульняў зафіксаваны рэкордныя для авіяпрадпрыемства паказчыкі па абслужаных самалёта-вылетах і пасажырах за адны суткі, напрыклад, 21 чэрвеня абслужана 208 рэйсаў, 1 ліпеня — 20 276 пасажыраў.

**Начальнік аддзела ўпраўлення пагранічнага кантролю Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Кузьма ЛЯСНЯК** лічыць, што дзяржаўны пагранічны камітэт Беларусі падчас падрыхтоўкі і правядзення II Еўрапейскіх гульняў выканаў пастаўленыя задачы. Перад правядзеннем турніру да прыёму турыстаў загадзя рыхтавалі як непасрэдна пункты пропуску, так і асабісты склад. Па словах прадстаўніка Дзяржпагранкамітэта, падчас турніру былі адзначаны выпадкі, калі замежнікі хацелі трапіць у Беларусь па падробленых дакументах, але такія спробы былі спынены. *«Атрыманы вопыт мы будзем выкарыстоўваць пры падрыхтоўцы да чэмпіянату свету па хакеі, які ў 2021 годзе прымуць Беларусь і Латвія»*, — адзначыў Кузьма Лясняк.

У 195 краінах гледачы ўбачылі 521 гадзіну прамых трансляцый спаборніцтваў II Еўрапейскіх гульняў. Агульная аўдыторыя гледачоў склала 250 мільёнаў чалавек без уліку тэлегледачоў з Расіі і некаторых іншых краін Еўропы, дзе канчатковыя даныя яшчэ не падлічаны. Мультыспартыўны форум асвятляла больш за 1200 прадстаўнікоў СМІ. У вядучых сродках масавай інфармацыі было зроблена амаль 3,5 тысячы ўнікальных публікацый. *«Так канцэнтравана і ў пазітыўным ключы пра Беларусь не пісалі яшчэ ніколі*, — заўважыў **намеснік дырэктара фонду «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 года» Анатоль КОТАЎ**, які прывёў гэтую статыстыку. — *Мы чакаем, што такая масіраваная пазітыўная рэклама нашай краіны дапаможа не толькі падвесці добрыя вынікі для турыстычнай галіны сёлета, але яшчэ больш сур'ёзны эфект прынясе ў наступныя гады. Вялікая тэле- і медыяаўдыторыя ўбачыла наш прыгожы край, і для многіх гэта стане пазітыўным матыватарам, каб прыехаць у адпачынак у Беларусь».*

*«На II Еўрапейскія гульні ў Беларусь мы запрасілі генеральнага сакратара Сусветнай турысцкай арганізацыі Зураба Палалікашвілі. У ходзе візіту адбыліся яго сустрэчы з Аляксандрам Лукашэнкам, намеснікам прэм'ер-міністра Ігарам Петрышэнкам, міністрамі спорту і турызму, замежных спраў, старшынёй Мінгарвыканкама*, — расказаў Міхаіл Партной. — *Генеральны сакратар Сусветнай турысцкай арганізацыі наведаў спартыўныя і турыстычныя аб'екты, у тым ліку «Дудуткі», вуліцы Кастрычніцкую і Зыбіцкую ў Мінску, дзе быў уражаны колькасцю замежных турыстаў. Зураб Палалікашвілі высока ацаніў наш турыстычны патэнцыял. Цяпер мы працуем над стратэгіяй развіцця турыстычнай галіны і законам аб турызме, Сусветная турысцкая арганізацыя будзе аказваць нам неабходную дапамогу ў падрыхтоўцы і карэкціроўцы гэтых дакументаў».*

**Старшыня праўлення Рэспубліканскага саюза турыстычнай індустрыі Філіп ГУЛЫЙ** адзначыў, што тураператары падчас II Еўрапейскіх гульняў зарабілі на 30 % больш у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года.

# З трох гадоў — і да...

## Алімпійская чэмпіёнка Ала Цупер удзельнічае ў стварэнні дзіцячага развіццёвага цэнтра ў Мінску

**Ён адкрыецца ў сталічным мікраёне Каменная Горка ў пачатку верасня. Кансультантам і адным з арганізатараў праекта з'яўляецца алімпійская чэмпіёнка Сочы-2014 па фрыстайле. У цэнтры будуць займацца дзеці ад 2 да 12 гадоў, іх разаб'юць на групы ў залежнасці ад узросту.**

Праграма для дзяцей ад двух да шасці гадоў накіравана на агульнае фізічнае развіццё. Іх не будуць мэтанакіравана рыхтаваць да вызначанага віду спорту. А ўжо ў старэйшых групах будзе зроблены акцэнт на гімнастыку. Наогул, адна з задач трэнераў — пошук талентаў і для іншых відаў спорту: у працэсе навучання будуць праходзіць кансультацыі аб схільнасці да таго ці іншага віду ў дзіцяці.

Па словах **трэнера-выкладчыка цэнтра Аляксандра СУГАНЯКА,** праграма для дзяцей рознага ўзросту будзе кардынальна адрозніваца: *«Для двухгадовых малянят плануюцца заняткі выключна з бацькамі. Трэніроўкі дзяцей ад трох гадоў будуць накіраваны на іх гарманічнае фізічнае развіццё. Тут важна не схіляць дзіця да вызначанага віду спорту, а падвесці яго да школьнага ўзросту здаровым і фізічна развітым».*



У праграме цэнтра — спартыўная гімнастыка, аздараўленчая гімнастыка, эстэтычная гімнастыка, фрыстайл, акрабатыка і паркур. Для кожнай групы сфарміравана ўласная праграма, якая ўлічвае асаблівасці і патрэбы дзяцей кожнага ўзросту. Заняткі будуць праводзіць вопытныя трэнеры, якія зарэкамендавалі сябе ў рабоце з дзецьмі. Адзначым, у падборы персаналу і падрыхтоўцы праграмы ўдзельнічала непасрэдна Ала Цупер. Сама алімпійская чэмпіёнка ўдзел у стварэнні цэнтра растлумачыла так: *«У першую чаргу я мама, у мяне двое дзяцей. На іх прыкладзе я бачу, як важна аддаваць увагу здароўю і фізічнай форме з самых малых гадоў. Цяпер многія дзеці не хочуць хадзіць у секцыі і вялікую частку вольнага часу праводзяць за камп'ютарамі і разнастайнымі гаджэтамі. Мне хочацца, каб Беларусь заўсёды заставалася спартыўнай краінай. Дзеці, якія вядуць актыўны лад жыцця, растуць больш здаровыя і мэтанакіраваныя. Як мама і спартсменка, я бачу сваю місію ў тым, каб дапамагчы будучаму пакаленню. Каменная Горка — гэта спальны раён, у якім жыве шмат маладых сем'яў. Таму вырашылі адкрыць дзіцячы цэнтр менавіта там».*

**Матэрыялы падрыхтавала Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

## Извещение о проведении электронных торгов

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Сукно», 220121, г. Минск, ул. Матусевича, д. 33 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом.1703, оф. 46 |
| **Адрес ЭТП** | www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронных торгов**

Изолированное помещение, по адресу: **г. Минск, ул. Матусевича, 33-1**

| Наименование (назначение) | Общ. пл. | Инв. номер |
|---|---|---|
| Кафе (помещение общественного питания) | 1007,9 кв. м | 500/D-798787125 |

**Начальная цена (с НДС 20 %): 1 356 600,00 бел. руб.** (Шаг аукциона: 67 830,00 бел. руб.)

**Ограничения/обременения:** ипотека, частичная аренда. Подробная информация размещена на сайте www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 08.06.2019

**Дата, время и место проведения электронных торгов:** 16.08.2019 в 11.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by). Дата и время окончания приема документов (предварительная регистрация): 14.08.2019 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by)

Изолированное помещение, по адресу: **г. Минск, ул. Матусевича, 33-2**

| Наименование (назначение) | Общ. пл. | Инв. номер |
|---|---|---|
| Административное помещение (административное помещение) | 3367,5 кв. м | 500/D-798787126 |

**Начальная цена (с НДС 20 %): 2 959 000,00 бел. руб.** (Шаг аукциона: 147 950,00 бел. руб.)

Ограничения/обременения: ипотека, аренда. Подробная информация размещена на сайте www.cpo.by.

Дата, время и место проведения электронных торгов: 30.08.2019 в 11.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by). Дата и время окончания приема документов (предварительная регистрация): 28.08.2019 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by)

| | |
|---|---|
| Порядок ознакомления: | Осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 17.00. Ответственное лицо: Жуковская Татьяна Евгеньевна, контактный телефон + 375 (29) 752-08-29 |

Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| Срок подписания договора купли-продажи | **15 (пятнадцать) рабочих дней после электронных торгов** |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее тридцати дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов.

**Электронные торги проводятся в порядке, установленном регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by.**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов и продавцу затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить организатору торгов установленное вознаграждение в течение **3 (трех)** рабочих дней после проведения электронных торгов.

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия.

| | |
|---|---|
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Лоевский комбинат бытового обслуживания» (продавец) в лице председателя ликвидационной комиссии Беланова Р. Н. извещает о проведении 30 августа 2019 года открытого аукциона по продаже имущества

**в 11.00 в г. Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж**

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20%), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20%), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Условие продажи:** Претендент на покупку (победитель) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества | | | |
| **Местонахождение лотов № № 1–17: Гомельская обл., г. п. Лоев, ул. Батова, 59** | | | |
| 1 | Электроводонагреватель ЭВАД-10 (инв. № 2328), 10 л., 1,6 кВт, 2009 г. в. | **100,00** | **10,00** |
| 2 | Установка для сухой чистки подушек «САНАС-ЗС» (инв. № 2546), 2013 г. в., состояние требует ремонта | **420,00** | **42,00** |
| 3 | Кресло парикмахерское с умывальником (инв. № 2331), 2009 г. в. | **280,00** | **28,00** |
| 4 | Кресло с гидроподъемником (инв. № 2333), 2009 г. в. | **110,00** | **11,00** |
| 5 | Блок парикмахерский с зеркалом (инв. № 2262), 2003 г. в. | **220,00** | **22,00** |
| 6 | Машина гладильная бытовая МГ-650 (инв. № 2309), 2007 г. в., мощность 1,3 кВт, длина валика – 650 мм | **290,00** | **29,00** |
| 7 | Станок строгальный универсальный (инв. № 771), 1988 г. в., мощность двигателя- 1,1 кВт, длина заготовки – 150 мм, состояние требует капитального ремонта | **80,00** | **8,00** |
| 8 | Станок деревообрабатывающий ВЗ-335 (инв. №5),1986 г. в., мощность привода – 3 кВт, ширина заготовки – до 300 мм, состояние требует капитального ремонта | **180,00** | **18,00** |
| 9 | Станок деревообрабатывающий универсальный (инв. № 839) 1989 г. в., состояние требует капитального ремонта | **80,00** | **8,00** |
| 10 | Пилорама Р63, оборудование конвейера в комплекте к раме РПМ0-02М (инв. № 2278), 2005 г. в., мощность – 44,4 кВт | **13 750,00** | **1 375,00** |
| 11 | Бетоносмеситель БС-270 (инв. № 2547), 2013 г. в., мощность – 1,5 кВт | **120,00** | **12,00** |
| 12 | Бетоносмеситель БС-270 (инв. № 2548), 2013 г. в., мощность – 1,5 кВт | **120,00** | **12,00** |
| 13 | Пресс для выд. сока (инв. №716), 1987 г. в., материал – нерж. сталь | **130,00** | **13,00** |
| 14 | Пресс ПВ для дробления яблок 10-15 кг (инв. № 895), 1990 г. в. | **150,00** | **15,00** |
| 15 | Машина д/изм. фруктов (инв. № 2326), 2009 г. в. | **150,00** | **15,00** |
| 16 | Машина д/выж. сока нерж. 20 л (инв. № 2325), 2009 г. в. | **530,00** | **53,00** |
| 17 | Прицеп тракторный 2ПТС 6.5, зав. № 0119, рег. № МЖ 6363, 2009 года выпуска, состояние – технически неисправен | **600,00** | **60,00** |

**Продавец:** ОАО «Лоевский комбинат бытового обслуживания», Гомельская область, г. п. Лоев, ул. Ленина, 24а. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.: 8 (029) 690-00-10 – председатель ликвидационной комиссии Беланов Руслан Николаевич. Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо:** 1) Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца имущества (ОАО «Лоевский комбинат бытового обслуживания»):** р/с BY66 BAPB 3012 4367 5001 3000 0000 в ОАО «Белагропромбанк» г. Минск, БИК BAPBBY2X, УНН 400028996, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); 2) Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно с 30 июля 2019 г. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 28 августа 2019 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам** Организатора торгов). Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем **за 3 (три) дня** до его проведения. Для участия в аукционе предоставляются: документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством). **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником** (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) %. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается Продавцом в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество, согласно договора купли-продажи и возместить затраты и расходы на организацию и проведение аукциона, в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Постановлением Совета Министров РБ от 08.01.2013 № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». **Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы». Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232)23-23-54, 23-23-56, 8(029)126-66-62**

## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже площадки для складирования, принадлежащей ООО «ПМИ инжиниринг»

Лот № 1: площадка для складирования, инв. № 500/С-1006973, площадь 4803 кв. м, 1983 г. п. Адрес: г. Минск, пр-т Партизанский, 168. Земельные участки: 1. Кадастровый номер 500000000002008477, площадь 2,5260 га. Право аренды по 31.05.2046. Доля: 7/20; 2. Кадастровый номер 500000000002006933, площадь 0,0649 га. Право аренды по 31.03.2027. Доля: 7/20. На земельных участках расположены иные объекты, которые не выставляются на аукцион. Начальная цена с НДС – 288 000 долл. США. Задаток – 15 000 долл. США. Шаг аукциона – 5 %.

**Аукцион состоится 19.08.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.**

Условия участия в аукционе, срок заключения договора купли-продажи, условия оплаты, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by. Продавец: ООО «ПМИ инжиниринг», г. Минск, ул. Пинская, д.18, подъезд 2, тел. 8(017) 336-94-57. Организатор аукциона: РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9. Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе **19.08.2019.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений **15.08.2019** в 11.00. Контактное лицо для осмотра Объекта – Леонович Сергей Сергеевич, тел. 8 (044) 702 48 20. Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 22.06.2019.

**Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, www.ino.by, e-mail: torgi@ino.by**

## Открытое акционерное общество «Небанковская кредитно-финансовая организация «Белинкасгрупп»

( www.belincasgroup.by)

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2019 г.

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | На 01.07.2019 | На 01.01.2019 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 1 682 | - |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 166 | 295 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 44 231 | 34 061 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | - | 8 983 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 1 | - |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | - | - |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 36 839 | 36 156 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | | 35 575 | 40 592 |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | | - | - |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | | - | - |
| 14 | Прочие активы | 1113 | | 2 036 | 1 157 |
| **15** | **ИТОГО активы** | **11** | | **120 530** | **121 244** |
| **16** | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | | - | - |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | | - | - |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | | - | - |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | - | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | | 2 083 | 926 |
| **24** | **ВСЕГО обязательства** | **120** | | **2 083** | **926** |
| **25** | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | | 121 002 | 121 002 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | | - | - |
| 29 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | | - | - |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | | (2555) | (684) |
| **31** | **ВСЕГО собственный капитал** | **121** | | **118 447** | **120 318** |
| **32** | **ИТОГО обязательства и собственный капитал** | **12** | | **120 530** | **121 244** |

### ОТЧЕТ о прибылях и убытках на 1 июля 2019 года

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | На 01.07.2019 | На 01.07.2018 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 2 144 | 330 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | - | - |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 2 144 | 330 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 3460 | - |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 2 | 1 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 3458 | (1) |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | - | - |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | - | - |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | - | - |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 6 | 195 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 8 788 | 567 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 16255 | 925 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | - | - |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | (1871) | (224) |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | - | - |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | (1871) | (224) |
| 18 | Сведения о прибыли на одну акцию в рублях | | | | |
| 19 | Базовая прибыль на простую акцию | 22 | | | |
| 20 | Разводненная прибыль на простую акцию | 23 | | | |

Председатель Правления А. С. Посканной

Главный бухгалтер Н. А. Ероховец

Дата подписания: 10 июля 2019 г. УНП 807000270

---

Свидетельство о государственной регистрации спортивно-оздоровительного унитарного предприятия «Маговей» (УНП 192774486) считать недействительным в связи с утерей.

---

Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости» сообщает о внесении следующих изменений в извещение о проведении 23 августа 2019 года 262-го открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной и иной собственности (опубликовано в газете «Звязда» 19.07.2019):
- по предмету аукциона № 75 графа 6 таблицы дополняется словами «(продажа шаурмы и сопутствующих товаров)».

**Телефон для справок +375 (17) 327 40 22. Адрес в сети интернет: www.mgcn.by.**

УНП 190398583

Памяць

# ТОЕ, ШТО НАС ЯДНАЕ

**У выдавецтве «Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі» ўбачыла свет кніга «Перамога адна на ўсіх. Беларусь — Узбекістан» — пра гераізм і мужнасць воінаў-узбекістанцаў, праяўленыя на тэрыторыі Беларусі ў час Вялікай Айчыннай вайны, а таксама пра тое, як увекавечана іх памяць на беларускай зямлі.**




— Новае выданне, якое толькі-толькі выйшла з друкарні, працягвае серыю кніг выдавецтва «Беларусь памятае: у імя жыцця і міру», якая ствараецца ў рамках рэспубліканскай акцыі «Беларусь памятае», — расказвае **дырэктар выдавецтва Уладзімір АНДРЫЕВІЧ.** — Кнігі серыі, якія паказваюць на фоне жахаў вайны гераізм і мужнасць абаронцаў Айчыны, мы імкнёмся рабіць востраэмацыянальнымі, сёння яны павінны абуджаць нашу ўнутраную патрэбу памятаць трагічнае і гераічнае мінулае свайго народа. Памяць — гэта тое, што нас аб'ядноўвае. Наша кніга расказвае і паказвае ўзбекаў, якія сярод многіх прадстаўнікоў вялікай краіны — Савецкага Саюза — бралі актыўны ўдзел у барацьбе супраць нацызму, у тым ліку ў важных, вызначальных для вынікаў вайны бітвах, што разгортваліся ў Беларусі.

У кастрычніку 1940 года Самаркандскім ваенкаматам Узбекістана 519 прызыўнікоў былі накіраваны для праходжання службы ў Брэсцкую вобласць. Дзесяць узбекістанцаў зацверджаны абаронцамі Брэсцкай крэпасці. Сярод іх — ураджэнец кішлака Ям Заамінскага раёна Джызацкай вобласці радавы Авазмат Ніямазаў, імя якога ўвекавечана на плітах мемарыяла Брэсцкай крэпасці. Сяржант Махамаджан Абдуваліеў, ураджэнец кішлака Татарык Кіраўскага раёна Ферганскай вобласці, 22 чэрвеня 1941 года служыў камандзірам гарматнага разліку 125-га стралковага палка.

З першых дзён вайны жыхары Беларусі прымалі самы актыўны ўдзел у барацьбе супраць нацысцкіх захопнікаў, шырока разгарнуўшы партызанскі фронт.

На беларускай зямлі ў партызанскіх атрадах і падполлі, здзяйсняючы гераічныя подзвігі, сярод прадстаўнікоў іншых 70 нацыянальнасцяў змагаліся і ўзбекі. У прыватнасці, у Брэсцкай вобласці ў партызанскім атрадзе імя Кірава дзейнічала інтэрнацыянальная рота, якой камандаваў узбек з кішлака Мітань Самаркандскай вобласці Лукман Уракаў.

Партызан-герой быў адзначаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Змагаліся з фашыстамі ў беларускіх партызанскіх атрадах і іншыя ўзбекі: Гантай Ташніязаў, Чыкір Джымакаў, Бегімкул Кульбаеў, Сабід Джалілаў, Саід Ісянаў, Маруф Джураеў, Хамід Усманаў, Гафур Хакімаў... Трох баявых ордэнаў удастоены беларускі партызан, ураджэнец Андзіжанскай вобласці Абдумаджыд Даўронаў.

Гераізм і бясстрашнасць паказалі воіны-ўзбекі пры фарсіраванні Дняпра, з якога і пачалося вызваленне Беларусі. Героямі ў тую пару былі ўсе, хто змагаўся на яго берагах, хто выжыў і быў узнагароджаны, хто загінуў безыменным. Днепр — рака Герояў. Толькі восенню 1943 года за фарсіраванне Дняпра звання Героя Савецкага Саюза ўдастоены каля 700 чалавек, а ў баях за вызваленне Брагінскага і Камарынскага раёнаў — 396 салдат і афіцэраў. Тады ж, пры фарсіраванні Дняпра, званне Героя Савецкага Саюза атрымалі 19 этнічных узбекаў і ўраджэнцаў Узбекістана.

— Тры гады працягвалася бітва за Беларусь. Сотні яе ўдзельнікаў былі ўдастоены высокага звання Героя Савецкага Саюза. У гэтай слаўнай кагорце — 32 воіны-ўзбекістанцы, — расказвае Уладзімір Андрыевіч. — У кнізе апісваюцца подзвігі кожнага, змешчаны іх фотаздымкі.

Беларусы беражліва захоўваюць магілы воінаў-узбекістанцаў на шматлікіх брацкіх могілках, ім узводзяцца помнікі, усталёўваюцца мемарыяльныя дошкі, прысвячаюцца асобныя экспазіцыі ў музеях розных узроўняў — ад Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны да школьных, у іх гонар названы вуліцы. Удзячныя жыхары беларускіх гарадоў і вёсак пастаянна наведваюць магілы паўшых герояў і ўскладаюць на іх кветкі.

— Падзеі ваеннага ліхалецця ўсё больш аддаляюцца ад нас, усё менш становіцца ветэранаў і ўдзельнікаў Айчыннай вайны, але пошукавая работа па выяўленні месцаў гібелі адважных воінаў працягваецца, нашчадкі даведваюцца пра месцы пахавання іх дзядоў і прадзедаў і могуць прыехаць у Беларусь наведаць іх магілы, — гаворыць Уладзімір Андрыевіч.

«Выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі» **з мэтай ушанавання памяці ўзбекістанцаў, загінуўшых на палях бітваў у гады Вялікай Айчыннай вайны ў Беларусі, упершыню публікуе ў кнізе спіс памяці «Незабытыя імёны».** У ім — устаноўленыя імёны больш чым тысячы воінаў-узбекістанцаў, якія загінулі ў баях за Беларусь у 1941—1944 гадах і пахаваны на беларускай зямлі. Магчыма, аб месцах гібелі і пахавання многіх воінаў-вызваліцеляў упершыню даведаюцца іх родныя і блізкія.

— Кніга «Перамога адна на ўсіх. Беларусь — Узбекістан», якая выдаецца ў год 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нацысцкіх захопнікаў, будзе важным унёскам у святую справу ўшанавання герояў Беларусі і Узбекістана — воінаў-пераможцаў. Важна, каб работа па пошуку новых звестак аб пахаваннях воінаў і вызначэнні імёнаў тых, хто загінуў, пашыралася і дапаўнялася, — падкрэслівае Уладзімір Андрыевіч. — Перакананы, што да яе, пазнаёміўшыся з кнігай, падключацца сваякі загінулых герояў з розных куткоў Узбекістана. Бо дэвіз «Ніхто не павінен быць забыты!» застаецца заўсёды актуальны. Захаванне памяці — залог захавання міру на ўсёй Зямлі.

**Уладзімір АЛЯХНОВІЧ.**

Фестывалім!

# СІНЯВОКІ, РОДНЫ, АДЗІНЫ...

## Ільняныя ручнікі, цацкі ды ежа на лён-фэсце ў Карэліцкім раёне



**Нацыянальная беларуская расліна, увекавечаная ў дзяржаўным гербе Беларусі як прыродны сімвал, спрадвеку карміла, лячыла, саграавала і ахоўвала нашых продкаў. Ільняная тканіна здаўна лічылася элітнай. У яе заварочвалі муміі егіпецкіх фараонаў, з яе шылі тунікі старажытнарымскім сенатарам, нават знакамітая турынская плашчаніца таксама было з ільну. А трываласць «паўночнага шоўку» такая, што з яго вілі карабельныя канаты і ладзілі парусы. Паслухаць гісторыі ды легенды пра адну з найстаражытнейшых культур беларускай зямлі, памацаць яе і нават пакаштаваць на смак змаглі госці свята ў аграгарадку Турэц.**

### Лён любіць паклон

Лён суправаджаў чалавека цягам усяго жыцця. Немаўля спавівалі ў пялюшкі, зробленыя з падола матчынай ільняной кашулі. Жаніх з нявестай мусілі абавязкова пастаяць на льняным ручніку. На вышываных ручніках апускалі ў зямлю труну з нябожчыкам.

Работа з ільном, дарэчы, вельмі цяжкая і доўгая. Пасеяны напачатку лета, вырваны ў канцы жніўня, зматы з першым снегам, спрадзены ўзімку з кудзелі ў ніці, лён пачыналі ткаць толькі ўвесну. І справа гэтая таксама карпатлівая і патрабуе сапраўднага ўмення.

Мясцовыя майстрыхі Надзея Іосіфаўна КОМАР з Турца і Данута Канстанцінаўна ЗАХАРЧУК з Вялікай Слабады сваімі цудоўнымі вырабамі нагадалі прысутным, якую прыгажосць можна ствараць з ільну, і наколькі даўгавечнымі і непаўторнымі могуць быць рэчы, зробленыя ўмелымі рукамі.

Тут вам і ручнікі, і пакрывалы, і абрусы, і сурвэткі... Бялюткія, больш цёмныя, чорныя... Шмат што ткалася ды вышывалася для пасагу, пасля часта дарылася. Данута Канстанцінаўна *(на фота)* кажа, што пачала займацца гэтым рамяством гадоў у 17, усю навуку пераняла ад мамы-ўдаліцы. А ўзор, гаворыць, часта бралі з фіранак, што даўней на вокны вешалі, кветачкі ўсялякія адтуль пераносілі на тканіну.

— Гэта яшчэ мама мая ткала, а я вышывала, — паказвае майстрыха пакрывала з чорнага льну, вышытае рознакаляровымі шарсцянымі ніткамі. — Паверсе былі чорныя штамповачкі, падсоўваеш пад іх мартушачку і праходзіш далей... Лічыш штамповачкі, колькі трэба пустых чорных, а колькі ўжо каляровых, каб узор зрабіць: лісцік, кветачку, галіначку. Тады штамповачкі ўбіраеш і падсоўваеш нітку. Мы з сяброўкай удваіх вышывалі цэлы тыдзень з васьмі раніцы да вечара, пакуль спаць не захочам. Мне гадоў 40 таму прапаноўвалі ад раёна ткацкі станок, дык я не знайшла памочніка сабе, з кім рабіць, і адмовілася. Вялікія рэчы — накшталт дзяружак ці пакрывала — не зробіш адзін, трэба дошчачку падымаць, перабіраць...



Для тых, хто нічога не цяміць у рамесніцкай навуцы, усё гэта здавалася незразумелым, аднак прыгажосць быў здольны ацаніць кожны.

### І з'есці, і сплесці

Сёлета ў Карэліцкім раёне лён-фэст прайшоў трэці раз запар. Прысвечанае сінявокаму абаронцу нашых продкаў свята аддае даніну павагі традыцыям мінуўшчыны і людзям, якія ўмелі ствараць з нацыянальнага багацця вечныя льняныя каштоўнасці.

Прыгожыя вырабы радавалі вочы гасцей фэсту, а печыва з ільняным семем, —



задавальняла смак. Булачкі, хлеб, крэкеры, пячэнне, згатаваныя вучаніцамі мясцовай турэцкай школы, проста прасіліся ў рот. У адну з печаных страў дзяўчаткі яшчэ тварог дадалі і грушу. Смаката, скажу вам! Школьніцы кажуць, што рэцэпты ўзялі проста з інтэрнэту.

— Цікавае свята ў нашай вёсцы зладзілі, і мы хацелі здзівіць усіх і паказаць, што лён — гэта яшчэ і ежа, — кажуць Ганна, Паліна і Надзея, аўтары страў, якія частавалі прысмакамі ўсіх прысутных.

А малодшыя школьнікі дапамаглі дарослым артыстам з Турца і Шчучына зладзіць для гледачоў канцэрт. Сваім «ільняным» танцам яны распачалі свята і задалі яму настрой на некалькі гадзін.

Нагледзеўшыся і наласаваўшыся, можна было самастойна зрабіць абярэг у хату з ільну. Майстар-клас па стварэнні лялькі-мотанкі праводзілі майстры з раённага дома рамёстваў. Яны паказвалі, як правільна наматаць нітку на спецыяльную дошчачку, пасля звіць яе ў ляльку, дадаўшы чырвонай ніткі, і атрымаць у выніку незвычайную цацку, магічную рэч і цёплы напамін пра свята.

**Ірына СІДАРОК,**
**фота аўтара.**

Вандроўныя нататкі

# ДЗЯРЖАВА НА ВЯЛЛІ

## «Зборнік» міфаў і іх расшыфроўка

**ВІЛЕЙСКІ край размясціўся ўздоўж ракі Вілія на мяжы з Віцебскай вобласцю. У гэтым месцы шмат помнікаў геалогіі — захавальнікаў таямнічых гісторый. Некаторыя з помнікаў з'яўляюцца адзінымі «ў сваім родзе» ў нашай краіне, чым яшчэ больш надаюць адметнасці гэтай мясцовасці.**

### Куранец. Прывітанне са Скандынавіі і плакучая яліна

Побач з Вілейкай, у мястэчку Куранец, ляжыць самы вялікі камень на Вілейшчыне — яго прынёс ледавік са Скандынавіі 220—150 тысяч гадоў таму. Даўжыня каменя шэсць метраў, вышыня два метры. Раней ён быў больш, яго некалькі разоў спрабавалі падарваць — марна. Паколькі валун вялікі і стары, людзі звязваюць з ім розныя легенды. Вось адна, якая дайшла да нас яшчэ з XIX стагоддзя: «Жыў тут шавец, які не прызнаваў хрысціянскіх свят. Аднойчы на Вялікдзень ён сядзеў у сябе дома і шыў боты. Бог угневаўся на яго за гэта, маланка ўдарыла ў дом шаўца і ператварыла яго ў вялікі камень. З тых часоў камень ніхто не можа скрануць з месца».

Кажучы пра гэта досыць старое мястэчка, нельга змаўчаць пра яго галоўную славутасць — плакучую яліну. Дзіўны цуд прыроды, яна лічыцца адзінай у Беларусі. У 1930-я гады дрэва прывёз з Варшавы мясцовы памешчык. Каб знайсці яліну, трэба ад'ехаць за Куранец па галоўнай дарозе ў напрамку вёскі Даўгінава і павярнуць на першым павароце налева. Дрэва ўражвае сваім выглядам — невялікае па памеры, але яго нескладана знайсці за агароджай. Яліна не падобная на звычайную елку, яна пухнатая і па форме сваёй не трохкутная, а авальная. Дарэчы, пад ёй можна схавацца ад дажджу: дрэва мае шчыльныя, густыя галіны, а авальная форма дае магчымасць залезці ўнутр.


Плакучая яліна.

### Камена. Варацішын камень

Гэтая вёска знакамітая сваёй назвай, дадзенай у гонар каменя. Валун уражвае сваімі памерамі і формай. На паверхні высечаны крыж з двума ашэсткамі і надпіс: «Воротишин Хрест». Вядомы філолаг Яўхім Карскі выявіў, што надпіс быў зроблены ў XI — XII стагоддзях. Некаторыя даследчыкі адносяць гэты валун да Барысавых камянёў. Калі ўважліва яго агледзець, можна ўбачыць на вяршыні дзве невялікія ямкі, што з'яўляюцца характэрнай рысай паганскай святыні. Гэты помнік упершыню адкрыў Канстанцін Тышкевіч. Даследчык Еўдакім Раманаў пісаў, што ніякіх легендаў у мясцовага насельніцтва пра камень няма. Гэта дзіўна, таму што сёння мясцовыя жыхары любяць апавядаць турыстам пра скарб і залатога каня. А пра назву «Варацішын» даследчык выказвае наступнае меркаванне: верагодна, крыж быў высечаны майстрам Варацішам альбо яго выбілі падчас паходаў як зварот да Бога па дапамогу. Такой самай думкі прытрымліваўся і гісторык Мікола Ермаловіч, лічачы, што гэты крыж і малітва былі высечаныя падчас паходу полацкага князя на яцвягаў.

Над Варацішыным каменем людзі начамі бачаць залатога каня. Прынамсі, так кажуць прыезджым. Паводле легенды, расказаной К. Тышкевічам (ён пазней запісаў гэта ў сваю кнігу «Вілія і яе берагі»), у Варацішын камень заключаны чалавек, які араў зямлю на Вялікдзень і быў за гэта пакараны адпаведным чынам. Цікава, што ў гэтай легендзе мы бачым паралель з куранецкай легендай пра шаўца.

### Рэчкі. Пячора на Замкавай гары

Гэта месца ў свой час досыць актыўна наведвалі археолагі, геолагі, а следам за імі і ўфолагі. Апошнія, варта адзначыць, зачасцілі сюды, а мясцовыя жыхары любяць расказваць ім гісторыі, як па палях блукаюць шаравыя маланкі. Артыкулаў пра гэтыя гісторыі ў інтэрнэце шмат, і ўсе яны заканчваюцца цьмяна, адказу на пытанне «Дык што ж гэта было?» няма — толькі здагадкі.

Месца па-сапраўднаму таямнічае — гэта адчуваецца, калі, пакінуўшы вёску, трапляеш у лес. Ён вабіць у глыб сваім маўчаннем, густым мохам, пахам смалы. Тут няма руху, старыя сосны, абы-як раскінутыя па пагорках, нібы застылі. Пагоркі гэтыя ўяўляюць вялікую цікавасць для навукоўцаў, бо ў іх знаходзіцца каштоўная інфармацыя аб працэсах, якія праходзілі падчас перадапошняга абледзянення.

Пагоркі фарміраваліся аж 220—150 тысяч гадоў таму падчас дняпроўскага абледзянення. Самы высокі — Замкавая гара, вышынёй 17 метраў. Яна мае дзіўную форму, якая нагадвае пірог у некалькі слаёў з валападобнай плоскай вяршыняй і стромкімі (да 45 градусаў) схіламі. На ёй даследчыкі знайшлі гарадзішча. Галоўнай адметнасцю гары з'яўляецца сапраўдная пячора, якая ўзнікла тут падчас паазерскага абледзянення, 20—15 тысяч гадоў таму. Сёння складана сказаць, антрапагенная яна ці ўсё ж такі прыродная. Пячору можна знайсці на паўночна-заходнім схіле гары. Зайсці ўнутр немагчыма: даўжыня пячоры складае прыблізна два метры. Аб'ект даследаваў і апісаў у XIX стагоддзі вядомы беларускі гісторык і археолаг Адам Кіркор. Каля падножжа гары можна знайсці пясчаныя кангламераты ў выглядзе слупоў, якія мясцовыя жыхары называюць проста «калонамі».

Рэчкаўскія пагоркі добра захаваліся: некранутыя дрэвы, густы пласт моху, сям-там буралом. Зразумела, з гэтым месцам людзі таксама звязвалі розныя гісторыі. Адна з легендаў кажа: «Вельмі даўно быў на месцы гары феадальны замак, у якім жыў князь. Бій сваіх слуг бязлітасна, а любіў толькі адно золата. Нейкі старац праходзіў аднойчы міма, спяваючы песню пра злачынствы князя. Той разгневаўся, загадаў схапіць небараку і павесіць. Перад смерцю старац прамовіў страшэнны праклён: «Правалiся пад зямлю разам са сваім замкам навечна і золата сваё ахоўвай!» У ноч пасля павешання здарылася бура. А раніцай слугі не ўбачылі ні князя, ні замка. На яго месцы ўзвышалася гара з уваходам у пячору».

Хто бывае тут упершыню, палохаецца таямнічай атмасферы, наслухаўшыся гісторый пра тое, як знаходзяць каля пячоры мёртвых звяроў, на якіх няма прыкмет гвалтоўнай смерці. А потым, падняўшыся на гару, раптам не атрымліваецца зрабіць здымкі, мабільная сувязь знікае, навокал усё быццам мёртвае, і з тунэлю маленькай пячоры дзьме халодны вецер...

Гэта сапраўды адбываецца, аднак справа не ў адмоўнай энергетыцы і прывідах гары, да якіх аматары вандровак. Даследчыкі лічаць, што ў пячоры мала паветра, а яшчэ мяркуюць, што тут збіраецца чадны газ, ад якога, хутчэй за ўсё, і гінуць жывёлы, што выпадкова трапілі ўнутр пячоры. Усё ж месца само па сабе ўнікальнае. На сённяшні дзень у Беларусі вылучаюць дзве пячоры: адна — каля Рэчак, і яшчэ адна, азёрная, знаходзіцца ў Глыбоцкім раёне.

Вядома ж, на гэтым гісторыі і паданні не заканчваюцца. Іх безліч. Кожны куток нашай краіны мае сваю гісторыю, якую захоўвае і па сённяшні дзень...

**Кацярына КАСЦЕВІЧ.**

Практычнае радзімазнаўства

# АЎТАВАКЗАЛ ДЛЯ ДАПЫТЛІВЫХ

**Знамянальныя даты Года малой радзімы стымулююць краязнаўчую актыўнасць і дапытлівасць. 95-годдзю раёна і 85-годдзю адкрыцця аўтастанцыі ў мястэчку Беразіно адсалютавала акцыя «Краязнаўчы прыпынак» на аўтавакзале, якую ініцыявала ідэалагічная служба аўтабазы № 22 і аддзела маркетынгу Бярэзінскай раённай бібліятэкі.**



У адзін з летніх дзён на пероне і ў зале чакання аўтавакзала пасажыры мелі магчымасць папоўніць скарбонку сваіх ведаў пра Бярэзіншчыну. Супрацоўнікі раённай бібліятэкі прэзентавалі бліцшоу «Казырныя факты пра Беразіно», «Вёска на біс», «Векапомнае», «7 цудаў Бярэзіншчыны», «Бярэзінскія самародкі», «Бярэзінская графіня».

Зацікаўленыя мінакі маглі азнаёміцца з серыяй краязнаўчых выданняў Бярэзінскай бібліятэкі з «Дарожнага чамадана краязнаўца».

Топ-7 «Вядомыя бярэзінцы» прадставіў эксклюзіўны вернісаж цікавых старонак біяграфій акадэміка М. Барысевіча, доктара гістарычных навук Э. Іофэ, мастака В. Ванькові ча, кампазітара М. Равенскага, народнага артыста В. Белахвосціка, краязнаўца П. Прыбыткіна, дырэктара танкавага завода Я. Рубінчыка цыкла «Малавядомае пра вядомых».

Краязнаўчы кіёск «Імгненная давედка» па запытах наведвальнікаў вакзала агучваў матэрыялы аб вёсках раёна. Самыя запатрабаваныя былі даведкі пра Багушэвічы, Любушаны, Пагост, Галаўныя Ляды, Дзмітравічы, Паплавы, Слабаду, Галынку.

Акцыя «Краязнаўчы прыпынак» на аўтавакзале зацвердзіла: кожнаму цікава ведаць пра родны край, дзе лёсіла нарадзіцца, жыць, працаваць.

Дарэчы, у папярэднія гады на аўтавакзале Беразіна намаганнямі бібліятэкараў былі зладжаны акцыі да 90-годдзя пуску першага аўтобуса Беразіно — Мінск і 30-годдзя Бярэзінскага аўтавакзала.

**Тамара КРУТАЛЕВІЧ.**

Калекцыя

# УСХОД — СПРАВА ТОНКАЯ,

## або Якія грошы раней выкарыстоўвалі ў Кітаі?

**2 жніўня а 17-й гадзіне ў Нацыянальным гістарычным музеі Беларусі адбудзецца адкрыццё міжнароднай выстаўкі «Старажытныя грошы Усходу — срэбра і папера». Экспазіцыя ладзіцца сумесна з Шэньянскім фінансавым музеем (Кітайская Народная Рэспубліка).**

Шэньянскі фінансавы музей знаходзіцца ў сталіцы правінцыі Ляанін горадзе Шэньян. Гэта адзін з самых буйных і папулярных у Кітаі музеяў фінансавага профілю, які беражліва захоўвае традыцыі камерцыйнай і дзелавой сталіцы паўночнага ўсходу КНР. У 2018 годзе Шэньянскі фінансавы музей падпісаў дагавор аб супрацоўніцтве з Нацыянальным гістарычным музеем Беларусі.

Музей валодае ўнікальнай калекцыяй з больш чым 6000 манет, банкнотаў, зліткаў каштоўных металаў і іншых грашовых сродкаў, якія выкарыстоўваліся ў Кітаі з самых



старажытных часоў і да нашых дзён.

На выстаўцы ў Мінску будуць прадстаўлены дакладныя копіі грашовых адзінак Кітая, срэбных зліткаў і банкнот ад эпохі дынастыі Тан (VII — X стагоддзі) да канца праўлення дынастыі Цын (пачатак XX стагоддзя). Арыгіналамі будуць прадстаўлены сучасныя калекцыйныя манеты і банкноты КНР, якія дэманструюць захаванне традыцый старажытных майстроў.

Выстаўка «Старажытныя грошы Усходу — срэбра і папера» пазнаёміць аўдыторыю з асаблівасцямі традыцыйнай фінансавай сістэмы Кітая. Экспазіцыя пакажа, якую ролю ў эканоміцы кітайскай цывілізацыі выконвалі срэбраныя злiткі, як паўсталі і развіваліся папяровыя грошы, што здзівілі і ўразілі ў свой час Марка Пола.

Наведвальнікі адкрыюць для сябе малавядомыя старонкі гісторыі старажытнай цывілізацыі, убачаць сучасныя грашовыя сродкі Кітайскай Народнай Рэспублікі.

Сумесны выставачны праект Нацыянальнага гістарычнага музея Беларусі і Шэньянскага фінансавага музея будзе садзейнічаць паглыбленню сяброўства паміж Беларуссю і Кітаем, дазволіць народам нашых краін лепш даведацца адзін аднаго.

Выстаўка будзе працаваць да 18 жніўня.

**Варвара ГОМАН.**

Пантэон Айчыны

# Афанасій Філіповіч

*(1597—1648)*

Жыццё Афанасія Філіповіча было драматычным і павучальным. Паверыўшы ў сваю абранасць быць абаронцам праваслаўя, ён асудзіў сябе на цяжкія выпрабаванні. Яго лічылі звар'яцелым, кідалі ў вязніцу, яму затыкалі рот, яму не верылі... Здавалася, ён губляў пачуццё рэальнасці, здавалася, ён сам не разумеў, што робіць, здавалася, ён сее нянавісць і варожасць... Супярэчлівы і просты, ваяўнічы і міралюбівы, вялікі і «недзный». Афанасій Філіповіч — гэты «правоверный слуга Божий».

Атрымаўшы добрую адукацыю ў брацкай школцы, верагодна, у Бярэсці, Афанасій у маладосці настаўнічаў «па науках церковно-русских». Сем гадоў вучыў «царэвіча маскоўскага» — яшчэ аднаго самазванага прэтэндэнта на царскі пасад Яна Фаўстына Лубу, якога апекаваў канцлер Леў Сапега.

Зрэшты, Афанасій зразумеў «опытность света» і ў 1627 годзе стаў манахам Віленскага Свята-духаўскага манастыра. Пасля былі Куцеінскі манастыр каля Оршы і Міжгорскі манастыр каля Кіева. Усё жыццё памятаў Афанасій наказы свайго духоўнага настаўніка айца Каментарыя: «Припамней, тые три речи заховай: перпшая — будь послушным старшим своим, другая — правила церковного пилнуй, третяя — бесед женских стережися. Тыя гды, даст Бог, сохраниш, спасёшся и будеш потребен на службу церкви Христовой». Гэтых правілаў Афанасій і прытрымліваўся.

Тры гады з 1633 года Афанасій у сане іераманаха ўзначальваў Дубайскі манастыр каля Пінска. Тут ён вёў змаганне са злымі духамі «видомыми и невидомыми». Магчыма, «злыя духі» — гэта свецкія спакусы, ці ў містычным азарэнні трызніліся яму д'яблы. Увогуле ў рэлігійнай экзальтацыі Філіповіч бачыў нейкія патаемныя знакі ці чуў голас Божай Маці.

Не толькі малітваю, але і справаю хацеў Афанасій служыць Богу. Восенню 1637 года Філіповіч пакінуў манастырскую келлю і пайшоў па сведце збіраць міласціну для манастыра. Міласціну ён рашыў прасіць у самага цара, нібыта самая Божая Маці, якая з'явілася да яго падчас малітвы, указала яму: «Цар московский здбуем ми церков! Иди до него».

Шлях да Масквы быў цяжкі. Філіповіч і яго спадарожнікі каля Прапошча трапілі ў страшэнную буру, блукалі доўга ў непагадзі і ледзь не патанулі ў Дняпры, ледзь не згарэлі ў будынку, дзе знайшлі сабе прытулак. Выпрабаванні Афанасій трываў мужна.



У Маскве ён усё ж трапіў на прыём да цара Міхаіла Раманава. Але коштам выдачы дзяржаўнай тайны пра «маскоўскага царэвіча», якога ён навучаў. Думаў, што робіць добрую справу, бо з-за гэтага самазванца магло быць «много злого». Здзіўляе наіўная прастата Філіповіча, калі ён шчыра правакуе цара на вайну з Рэччу Паспалітай у абарону праваслаўя. І зноў, нібыта гэта пажаданне Божай Маці, якая нібыта загадала яму сказаць цару: «звитяжай неприятели наши». З-за рэлігійнага фанатызму ён не разумеў, што распальвае нянавісць сярод хрысціян. Здаецца, Філіповіч жыў сваімі апантанымі пачуццямі, а не разважлівым розумам. Аднак ён не шукаў асабістай карысці ці славы. Сваю місію вызначаў сціпла: «А запытает ли хто: «Чи пророк ты, што то мовіш?». В покори сердечной одповем: «Не пророк, только слуга Бога сотворителя моего, посланый ведлуг часу, абым правду каждому мовил». І праўду ён казаў, нават каралю Уладзіславу Вазе, пераканаactive, што яна дапаможа ўсталяваць справядлівасць, не разумеючы, што праўду не любяць і таго, хто яе кажа, таксама. За сваю праўду Афанасій апынуўся ў становішчы, калі яго ненавідзелі і чужыя, і свае — ён быў гнаны і зняважаны.

Пасля вяртання з Масквы ў 1640 годзе Філіповіч стаў ігуменам Сімяонаўскага манастыра ў Бярэсці. Апантана ён абараняе манастыр ад захадаў уніятаў заваладаць святыняй. І нібыта пачуўшы голас Купяцікай Божай Маці, каб патрабаваў ад караля Уладзіслава Вазы, «грозячи правдивым гневом и страшным судом Божим», адмены царкоўнай уніі, Афанасій Філіповіч шчыра паверыў, што на яго «пал» дух святы і ён абраны для святой місіі. А таму на сойме ў 1643 годзе Афанасій не толькі патрабуе ад караля скасавання уніі, але і пагражае каралю Божым гневам. Гэта была адкрытая абраза каралеўскай годнасці. Сойм не адобрыў гэтага выступлення. Праваслаўныя іерархі адцураліся нястрымага ігумена і абвясцілі яго вар'ятам. Філіповіча пасадзілі ў вязніцу, каб не нарабіў большага глупства і не наклікаў бяды на праваслаўную царкву. Невядома як Афанасій вызваліўся, але на волі ён у крайнім запале бегаў па варшаўскіх вуліцах і крычаў: «Беда проклятым и неверным!» Яго зноў засадзілі ў вязніцу. Духоўны суд над ім у Кіеве ўсё ж вызваліў яго з няволі, але ненадоўга. Філіповіч зноў апынуўся ў вязніцы, ужо за выдачу тайны «маскоўскага царэвіча». За паўгода зняволення Афанасій напісаў некалькі публіцыстычных твораў у абарону праваслаўя і з нападкамі на унію. Па каралеўскім наказе кіеўскі мітрапаліт замкнуў непакорлівага манаха ў Кіева-Пячэрскім манастыры, каб той «не могл жадных (ніякіх) голосов робити». Тут у цеснай келлі Афанасій напісаў свой галоўны твор — «Дыярыуш» — адзін з шэдэўраў старадаўняй беларускай літаратуры. «Дыярыуш» — не толькі ўспаміны аўтара, але і выкрывальныя прамовы, і багаслоўскія думкі, і гарачая палеміка, і рэлігійныя гімны. Аўтар сабраў пад адной вокладкай перажытае і перадуманае, каб перадаць свой духоўны набытак: «...для ведомости людем православным, хотячим о том тепер и у потомные часы ведать».

На свабоду Афанасій выйшаў пасля смерці кіеўскага мітрапаліта Пятра Магілы на пачатку 1647 года і вярнуўся ў свой манастыр у Бярэсці. Тут і напаткала яго пакутніцкая смерць. 5 верасня 1648 года яго расстралялі жаўнеры па даносе аб сувязях з казакамі Багдана Хмяльніцкага. Берасцейскі ваявода не стаў высвятляць віны Філіповіча і выдаў яго на расправу. Ён вытрымаў катаванні агнём, але не адмовіўся ад поглядаў: «Што юж рекл, том рекл, а з тым умираю». Перад смерцю Афанасій прадрок праследаванне праваслаўнай царквы, але пасля і яе росквіт «як крын сярод царноўнікаў і яе іскра ў попелу зарытая з'явіцца, зазіхаціць і ўсё асвеціць». Зрэшты, так і сталася. Толькі праз доўгі час і праз цяжкі цярністы шлях праваслаўная царква заняла свае адметнае і годнае месца ў духоўным жыцці Беларусі. А апантаны змагар за яе — святы прападобнамучанік Афанасій Філіповіч — стаў адным з нябесных заступнікаў Беларусі.

**Вітаўт ЧАРОПКА.**

Сваімі словамі

# ЛЁГКІ СУМ І КІСЛАВАТЫ СМАК?..



## або Мінус на мінус дае выразны плюс

**Часам хочацца крышку пасумаваць. І не заўсёды гэта дрэнна. Плыні суму непазбежна набягаюць пасля вельмі добрага часу — як бурапенная хваля, якая сыходзіць з узбярэжжа, пакідае аскепкі ракавін. Сумаваць — значыць падводзіць вынікі. Думаць пра важнае і не вельмі, пра тое, што насамрэч прыносіць асалоду, а што варта пакінуць, — і такім чынам выстаўляць для сябе некаторыя арыенціры.**

Прыблізна такі стан быў у мяне ў мінулы панядзелак. З аднаго боку, хацелася крышку мінору. Бо я толькі што прыехала з выезду на прыроду, у лес, дзе была ў цудоўнай кампаніі, — вярнулася ў звыклую рэальнасць. А, з іншага боку, душа прагнула працягу свята.

Вось і трапілася мне ў метро рэклама спектакля «Юбілей ювеліра» ў Нацыянальным купалаўскім тэатры. У сеціве знайшла апісанне — пастаноўка створана спецыяльна для найстарэйшай трупы тэатра — тых артыстаў, якія ўжо на заслужаным адпачынку. Талент з узростам нікуды не знікае, таму гэтых акцёраў вырашылі задзейнічаць.

Дзівосным чынам «Юбілей ювеліра» спраўдзіў мае ўнутраныя чаканні і трапіў, што называецца, у самы яблычак. Лёгкі салодкі роздум разліваўся ў зале. Ён плаўна перацякаў у пэўную багемную ўзнёсласць, захапленне. Напаўняў той асалодай, якую атрымліваеш хіба што ў сталічным Купалаўскім тэатры.



**Сцэна з маладосці галоўных герояў спектакля «Юбілей ювеліра».**

У спектаклі ад самага пачатку закранаюцца многія магістральныя для кожнага чалавека тэмы. Гаворыцца пра тое, што жыццё аднойчы скончыцца і, можа быць, скон ужо стаіць за дзвярыма. І ці хопіць часу зрабіць штосьці самае важнае? Пра тое, што мара неабходна кожнаму чалавеку: без яе жыццё будзе паўколерным. Гэты спектакль і пра сварлівую жонку — прытым яна каханая і кахае! Ён пра складаныя адносіны бацькоў і дзяцей — і пра тое, што гэтыя адносіны павінны быць для кожнага вялікай каштоўнасцю.

У «Юбілеі ювеліра» амаль 90-гадовы хворы нязломна верыць у сваю светлую зорку. Жанчына, якую ніхто ў жыцці не любіў і не казаў ёй добрых слоў, адважваецца стаць каралевай!.. А жонка таго самага хворага горача прызнаецца, што і кахае, і раўнуе яго вельмі моцна, нягледзячы на ўсе кропельніцы і таблеткі...

Сцэны з маладосці герояў зроблены надзвычай яскрава — яны нібы знаходзяцца ў галаграме, размаўляюць і танцуюць адно з адным у іншым, паралельным свеце — ад гэтай прыгажосці немагчыма адвесці позірк.

...У сваім рабочым раскладзе каралева пазначыла сустрэчу з галоўным героем на 60 гадоў наперад! А каралі, як вядома, не спазняюцца. Тут яшчэ раз успамінаеш пра пунктуальнасць — тую самую, якая з'яўляецца ветлівасцю маршых асоб. Аднак ці пацвердзіцца яна гэтым разам?..

Разам з акцёрамі Купалаўскага тэатра перажываеш той сум, каторы неаддзельны ад радасці. Прасейваеш сваю паўсядзённасць праз сіта значнасці. І разумееш, што на некаторых важных рэчах трэба мацней сканцэнтравацца. І што некаторыя, на першы погляд неістотныя, з'яўляюцца сапраўднай каштоўнасцю.

* * *

Дапоўніць усприманне спектакля (ці чагосьці падобнага да яго) можна, як бы банальна для кагосьці гэта ні гучала, бутэрбродам з ласосем і кавалачкам лімона і грэйпфрутавым сокам, набытымі ў антракце ў тэатральным буфеце. Кіслы смак, памножаны на лёгкі сум, як той мінус на мінус, дае яскравы, выразны плюс. Бо пакуль чалавек жывы, ён заўсёды знойдзе нагоду для радасці. І зусім маленькую або нават агромністую мару.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

Запрашальнік

# СПАРТЫЎНЫ «ЧАЛАВЕК БУДУЧЫНІ»

**«Спорт — гэта высокае мастацтва» — такі тэзіс не выклікае сумневаў, і таму адпаведную назву мае выстаўка, якая праходзіць у сталічным Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў, што па вуліцы Някрасава, 3. Экспазіцыя працягне сваю работу да 14 верасня. А ўжо сёння ў 18.30 яе можна паглядзець разам з куратарам Дзінай Даніловіч.**

У міжнароднай выстаўцы прымаюць удзел фатографы і мастакі з 12 краін: Азербайджана, Арменіі, Беларусі, Бельгіі, Вялікабрытаніі, Германіі, Грузіі, Іспаніі, Літвы, Польшчы, Расіі, Славакіі. Гасцям і жыхарам сталіцы прадстаўлена маштабная экспазіцыя архіўнага фота і сучасных фатаграфічных праектаў, плакатаў, відэаэапісаў, скульптурных аб'ектаў, звесткі пра перформансы. Усе гэтыя матэрыялы даследуюць тэму спорту ў шырокім культуралагічным, гістарычным і сацыяльным кантэксце.

Зыходным пунктам экспазіцыі стала калекцыя архіўных фатаграфій і кіназапісаў са збору Беларускага дзяржаўнага архіва кінафотафадакументаў, якая ілюструе асаблівасці культуры спартыўнага цела ў савецкі перыяд (1940—1970-я гады). Фотаздымкі і кінакадры спартыўных спаборніцтваў, усесаюзных спартакіяд, спартыўных парадаў, працэсу падрыхтоўкі і трэніровак атлетаў, партрэты



**Што такое «калектыўнае цела»? Чаму вушы спартсменаў сталі тэмай фотапраекта? Пра гэта сёння распавядзе куратар праекта Дзіна Даніловіч.**

выдатных спартсменаў таго часу з'яўляюцца дакументамі цэлай эпохі, калі культ здаровага, моцнага цела асацыяваўся з маладосцю і сілай краіны, а масавае захапленне спортам было часткай глабальнага працэсу выхавання «чалавека будучыні».

Трапіць на выстаўку можна па ўваходных білетах у Нацыянальны цэнтр сучасных мастацтваў.

**Васіль КАРАБЛЁЎ.**

# ПРАХАЛОДНА І З НЕВЯЛІКІМІ ДАЖДЖАМІ

**Надвор'е на гэтым тыдні, у адрозненне ад мінулага, чакаецца адносна роўнае. Спякоты не абяцаюць, зрэшты, як і вялікіх дажджоў. Падрабязней пра сінаптычную абстаноўку расказалі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Атмасферны фронт, які завітаў у нашу краіну ў панядзелак, у аўторак працягне выціскаць гарачае паветра на поўдзень. Таму па Брэсцкай вобласці яшчэ прыпячэ да 24—28 градусаў, але на астатняй тэрыторыі будзе прыкметна халадней: 17—23. Дажджы чакаюцца толькі на паўднёвым захадзе, дзе-нідзе з навальніцамі.

У сераду ўначы пахаладае да 5—12 градусаў. Ды і днём будуць непрывычныя для канца ліпеня плюс 14—21. Дажджы пройдуць у асобных раёнах па паўночным усходзе. Брэсцкай вобласці выпадзе шанц пагрэцца — там чакаецца да 25 цяпла.

А вось у канцы рабочага тыдня пачне паступова цяплець. Калі ў чацвер будзе 16—23 цяпла, то ўжо ў пятніцу — 18—25. Па Брэсцкай вобласці паветра прагрэецца на пару градусаў болей. Месцамі пройдуць дажджы. Ноччу і раніцай чакаюцца слабыя туманы.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

**Наименование банка: ОАО «Банк БелВЭБ»**

Юридический адрес ОАО «Банк БелВЭБ»:
Республика Беларусь, 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 29

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2019 г.

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | на 01.07.2019 | на 01.01.2019 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 57 620 | 68 381 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | 419 | 334 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 432 787 | 466 250 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 174 678 | 214 992 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 746 972 | 736 259 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 2 681 786 | 2 588 276 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | 211 | – |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 13 399 | 13 399 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 154 969 | 158 123 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | 4 | – |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | 928 | 936 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | 12 | 12 |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 26 860 | 23 307 |
| **15** | **ИТОГО активы** | **11** | **4 290 645** | **4 270 269** |
| **16** | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | 20 | 22 |
| 18 | Средства банков | 1202 | 1 328 197 | 1 369 041 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 2 315 749 | 2 219 090 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | 50 278 | 102 989 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | 244 | – |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | – | – |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 38 415 | 39 850 |
| **24** | **ВСЕГО обязательства** | **120** | **3 732 903** | **3 730 992** |
| **25** | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 117 408 | 117 408 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | – | – |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 65 898 | 65 898 |
| 29 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 54 462 | 52 225 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 319 974 | 303 746 |
| **31** | **ВСЕГО собственный капитал** | **121** | **557 742** | **539 277** |
| **32** | **ИТОГО обязательства и собственный капитал** | **12** | **4 290 645** | **4 270 269** |

## ОТЧЕТ о прибылях и убытках

за 6 месяцев 2019 года

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | за 6 месяцев 2019 года | за 6 месяцев 2018 года |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 139 558 | 141 144 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 68 872 | 64 849 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 70 686 | 76 295 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 49 024 | 49 238 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 16 166 | 17 457 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 32 858 | 31 781 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | 97 | 53 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 32 | 230 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 9 103 | 7 177 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | (1 398) | (28) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 26 221 | 12 120 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 6 458 | 3 071 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 67 249 | 66 501 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 8 262 | 4 317 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 16 104 | 35 641 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 15 | 7 683 |
| **17** | **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)** | **2** | **16 089** | **27 958** |

Председатель Правления банка В. С. Матюшевский

Главный бухгалтер И. И. Мерзлякова

Дата подписания 11 июля 2019 г.

*Бухгалтерская (финансовая) отчетность размещена на сайте www.belveb.by в разделе «О банке / Финансовые показатели деятельности банка / Квартальная финансовая отчетность / Квартальная финансовая отчетность за 2019 год, составленная в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь».*

*ОАО «Банк БелВЭБ». Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности от 21.12.2018 № 6. УНП 100010078.*

---

**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении 04.09.2019 повторного открытого аукциона (цена снижена на 50 %)**

